ЗЬВАЗДА

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

№ 179 (3287) Чацьвер, 8-га жніўня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—819, кантора—781

РАДЫЕ *У ГАДЗ. НОЧЫ:*

ТОКІЁ, 7. Па паведамленьні харбінскага друку, там чакаюць, што былы кітайскі пасланьнік у СССР Чжа Шао-ян адновіць перагаворы з савецкімі прадстаўнікамі. Па гэтых вестках у Харбіне чакаюць, што „т. Серабракоў, які прыбыў у Даўрыю", хутка прыбудзе на ст. Манчжурыя.

(Па вестках ТАСС, т. Серабра коў знаходзіцца ў Маскве і нікуды не выязджаў).

АПОШНІЯ НАВІНЫ **Б. С. С. Р.**

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Пленум Бабруйскага гарадзкога савету абраў сакратаром гарсавету рабочага заводу «Чырвоны Харчавік» тав. Акуліча. Тав. Акуліч працуе на заводах з 1919 году, служыў доўгі час у Чырвонай армії. У апошні час быў сакратаром партыйнай ячэйкі. Калектыў рабочых вылучыў яго на працу ў гарадзкі савет.

На шляхох масавай калектывізацыі

Калгасны рух за апошнія два гады далёка пасунуўся наперад. Спробы ідэалёгаў правай апазыцыі ўкласьці яго ў рамкі цікавага сацыяльнага вопыту аказаліся мізэрным замахам з нягодными сродкамі. Тэмп ростт калгаснага руху, які перавышае ўсе плянавыя меркаваньні, выразна выявіў масавую цягу беднаты і сераднякоў да буйнае аграмаджанае гаспадаркі і ў зьвязку з гэтым роля калгасаў, як сур'ёзнейшага гаспадарчага фактару ўздыму і сацыялістычнага перабудаваньня сельскае гаспадаркі прызнаецца ўжо ў сучаснай рэчаіснасьці.

У бягучым годзе **калгасы дадуць каля 1 мільёну 640 тысяч тон хлеба. За адзін год пасеўная плошча калгасаў узрасла з 4.200.000 гэктараў да 4-х мільёнаў 400 тысяч.** У надыходзячым 1929-30 г. г. мяркуецца паскорыць тэмп росту, які ў некаторых раёнах павінен даць павялічэньне пасеўных плошчаў у калгасах у тры разы. Прычым, усе гэтыя меркаваньні зусім рэальныя, яны ўгрунтаваны на налічных магчымасьцях ахвату і падвядзеньня больш высокай тэхнічнай базы пад мясцовую індывідуальную гаспадарку.

Папярэдніе гэтых магчымасьцяй залежыць у асноўным і галоўным ад росту забесьпячэньня машынамі, будаўніцтва і ўвозу трактараў і камбайнаў, забесьпячэньня калгасаў мінэральнымі ўгнаеньнямі, г. зн. ад тэмпу індустрыялізацыі краіны. Аб жыцьцёвасьці і своячасовасьці калгасаў, як масавай формы арганізацыі сельскае гаспадаркі, лепш за ўсё гавораць факты масавай калектывізацыі ў радзе раёнаў. Так, напрыклад, на Урале—у Ірбіцкай акрузе, раёны суцэльнай калектывізацыі (Еланскі, Байкалаўскі і Знаменскі) ахватваюць 22 сельсаветы і 3.778 сялянскіх гаспадарак, г. зн. 54 проц. усяго ліку гаспадарак у паказаных раёнах. У Мэханскім раёне, Шадрынскае акругі, тэй жа Уральскай вобласьці ў калектывы ўцягнуты 4.101 сялянская гаспадарка з агульнай сумы 5.406 г. зн. звыш 75 проц.

У аснове гэтага працэсу масавай калектывізацыі ляжыць прасяканьне ў сельскую гаспадарку буйнай машыны, якая робіць карэнныя рэвалюцыйныя зьмены ў тэхніцы і сацыяльных адносінах вёскі. Тут сапраўды адбываецца разьвіцьцё тых форм «пагалоўнага» і «поўнага» каапэраваньня, якія былі геніяльна вызначаны Леніным. Калектывізацыя вялікіх абшараў нямысліма бяз буйной машыны. Яна ўзьнікае на аснове машыны і ў сваю чаргу дае буйнейшы штуршок да далейшага прасяканьне машыны ў сельскую гаспадарку. Буйны калгас становіцца кіруючым гаспадарчым пачаткам у сваім раёне. Пры цяперашнім тэмпе росту і ўзбуйненьня калгасаў ня можа быць сумненьня ў тым, што заданьні пяцігодкі на бліжэйшыя гады будуць ня толькі выконвацца, але і значна перавышацца. Трэба памятаць, што патрэбы бурна ўзрастаючага калгаснага руху прад'яўляюць вялікі рахунак да ўсіх галін народнае гаспадаркі і ў першую чаргу да с.-г. машынабудаўніцтва.

Буйная мэханізаваная гаспадарка мае патрэбу ў плянавым рэгулярным забесьпячэньні сродкамі вытворчасьці, мат'яламі і кваліфікаванай людзкой сілай. Вось адкуль вынікаюць новыя формы адносін паміж калгасам і рабочай дзяржавай, якія спрабавала замазаць правая апазыцыя. У бягучую хлебазагатоўчую кампанію большасьць калгасаў паказвае на справе сваё правільнае разуменьне адносін з рабочай дзяржавай. І тым больш ёсьць падстаў націснуць на адстаючых, жадаючых жыць пад гнілым лёзунгам: бяры, але не давай.

У калгасным будаўніцтве партыя бачыць ужо пры сучасным этапе нэп'у прыладу сацыялістычнай рэканструкцыі. Магутнасьць гэтае прылады будзе няўхільна ўзрастаць у зьвязку з разьвіцьцём індустрыялізацыі краіны, умацаваньнем пралетарскіх пазыцый у народнай гаспадарцы і ўмацаваньнем пралетарскага кіраўніцтва ў самым калгасным руху.

Трэба паставіць перад калгасным рухам пытаньні барацьбы з унутранымі недахопамі: з цякучасьцю складу, з слабым ростам элемэнтаў аграмаджаньня, асабліва непадзельных капіталаў, безгаспадарчасьцю і бясплянавасьцю, з невыкананьнем абавязацельстваў перад дзяржавай і інш. Усе гэтыя задачы разьвіцьця калгасаў і барацьбы з іх недахопамі востра ставяць пытаньне аб кіраўніцтве рухам. Партыя павінна бліжэй падысьці да руху, разглядаючы кіраўніцтва ім таксама, як і кіраўніцтва ўсімі іншымі галінамі аграмаджанага сэкару народнае гаспадаркі.

Не ўвядзіць у калгас або ня ўдзельнічаць у калгасным руху значыць стаяць у баку ад асноўных шляхоў клясавай барацьбы з кулаком. Ці можа так ставіцца пытаньне ў адносінах да камуністага? Іменна на сучасным этапе ўкаранеўня калгасаў у сельскую гаспадарку, кулацкае супраціўленьне набыло асабліва жорсткія формы і выяўляецца ў падпалах, забойствах і г. д. Кулак—галоўная перашкода для разьвіцьця калгасаў на вёсцы. І перш за ўсё з боку калгасаў павінен быць удар па кулаку. Ва ўсёй гэтай барацьбе і рабоце калгасу павінна быць забясьпечана цьвёрдае, надзейнае партыйнае кіраўніцтва.

(«ПРАВДА»).

Усеагульная забастоўка румынскіх гарнякоў у Жылаўскім раёне

Гарнякі захапілі электрастанцыю і вадаправод

ВОЙСКА І ЖАНДАРЫ ЗАЛПАМІ СТРАЛЯЛІ У БАСТУЮЧЫХ

Дзесяткі гарнякоў забіты, некалькі соцень паранены

(НАЧНОЕ РАДЫЁ)

ВЕНА, 7. Па паведамленьнях з Клаўзэнбурга (Румынія) у Мутэнах (цэнтр вугольнага раёну Жылаўскай лагчыны) адбыліся крывавыя сутычкі бастуючых гарнякоў з войскам. Забастоўка пачалася стыхійна 5-га жніўня з прычыны адхіленьня прадпрыемцамі патрабаваньняў аб павышэньні зарплаты і зьніжэньні 8-гадзіннага рабочага дня. Выбухнуўшы спачатку на 2-х капальнях, забастоўка потым абярнулася ва ўсеагульную.

Бастуючыя гарнякі акружылі электрычную станцыю вугольнага раёну, прагналі інжынэраў і варту, занялі вадаправод і зьвярнуліся да рабочых электрычнай станцыі з заклікам далучыцца да забастоўкі. Рабочыя, якія абслугоўваюць станцыю, далучыліся да бастуючых, і ўся Жылаўская лагчына засталася без сьвятла.

Вугольныя капальні заняты палком румынскай пяхоты і ўзмоцненым атрадам жандараў. Камандзір палка прад'явіў бастуючым патрабаваньне стаць безагаворачна на работу і ачысьціць электрастанцыю, а таксама вадаправод. Бастуючыя адказалі на гэта патрабаваньне масавай дэманстрацыяй і заклікам да гарнякоў другіх капальняў данага раёну прыйсьці на дапамогу. Войска пала некалькі залпаў па бастуючых.

Па даных румынскага друку 32 гарнякі забіты і некалькі соцен паранены. Вадаправод і электрастанцыю, якія рабочыя захапілі, войску ўдалося запяць толькі пад вечар. Аднак пусьціць іх у рух не ўдалося, і ўся Жылаўская лагчына засталася ў ноч на сераду без сьвятла.

Колькасьць забітых на сёнешні дзень дакладна не ўстаноўлена. Па прыватных вестках, яна значна вышэй газэтных даных. У раёне вакзала і ў ваколіцах гораду выяўлена вялікая колькасьць трупаў рабочых і шмат сьмяртэльна параненых. Усе школы раёну абернуты ў амбуляторыі.

Па афіцыяльнай вэрсіі бастуючыя стралялі першыя і паранілі некалькі жандараў.

Капальні, электрастанцыя і вадаправод засталіся пад аховай войска. Афіцыёзныя органы запэўняюць, што пасьля масавых расстрэлаў забастоўка ў вугольным раёне спынілася і што пануе «поўны спакой». Між тым, з другіх крыніц паведамляюць аб вялізным хваляваньні рабочых усёй Жылаўскай лагчыны.

Надзвычайны посьпех дня індустрыялізацыі

На фабрыках і заводах 100 проц. яўка

ЛЕНІНГРАД, 6. Дзень індустрыялізацыі ў **Ленінградзе** прайшоў з вялікім уздымам. Можна беспамылкова лічыць, што ленінградзкі пралетарыят прыняў максымальны 100 процантны ўдзел у адпрацоўцы дня для фонду індустрыялізацыі і абароны краіны. Дзэзэртыраў на працоўным фронце ня было. Ня толькі на фабрыках і заводах, але і ва ўстановах і на будаўнічых работах няпрыкметна было сёньня ніякага зацішша. Так, напрыклад, у Васільева-востраўскім раёне, дзе разгорнуты буйнейшыя каналізацыйныя работы, сэзоньнікі-будаўнікі выйшлі ў большым складзе, чым у звычайныя дні. На многіх прадпрыемствах пачатак сёньняшніх работ насіў урачысты характар. Ля брам і прахадных кантор рабочых сустракала музыка, заводская адміністрацыя і фабрычна-заводзкія камітэты віталі рабочых, што прышлі працаваць для дня індустрыялізацыі. На некаторых заводах да работ адбыліся агульна-заводзкія або цэхавыя мітынгі, на іншых прадпрыемствах мітынгамі канчаўся дзень. Увечары ва ўсіх клюбах, дамох культуры і садох адбыліся гуляньні і розныя пастаноўкі для рабочых і іх сем'яў, прысьвечаныя дню індустрыялізацыі. Матар'яльныя вынікі адпрацоўкі 6-га жніўня вельмі значныя.

Дзень індустрыялізацыі ў Маскве

МАСКВА, 6. Энтузіязм, з якім працавалі ўчора на індустрыялізацыю рабочыя Масквы, зьяўляецца лепшым довадам таго, што ўзяты партыяй тэмп індустрыялізацыі забясьпечаны калектыўнаю працаю рабочае клясы. Фабрыкі, заводы і ўстановы працавалі, як у звычайныя буднія дні з тэй толькі розьніцай, што прагулы рэзка вымяніліся, а інтэнсыўнасьць працы павялічылася. На хрустальным заводзе з 710 чалавек на работу прышло 708. На заводзе «Борец» з 1.200 чалавек не зьявіліся толькі 2. На трубным заводзе яўка была 100 процантнай. Многія, што працавалі напярэдадні ў начной зьмене, зноў зьявіліся на работу. Пасьля работы на фабрыках, заводах і ва ўстановах праводзіліся сходы з дакладамі аб значэньні дня індустрыялізацыі. Абмяркоўваўся пяцігадовы плян свайго прадпрыемства, абгаворваліся пытаньні вынажэньня сабекошту, узьвяцьця прадукцыйнасьці працы і г. д.

***

МАСКВА, 7. Паведамленьні з розных гарадоў РСФСР паказваюць, што дзень індустрыялізацыі прайшоў з вялікім уздымам і энтузіязмам і даў вельмі значны матар'яльны эфэкт. **У Туле** дзень індустрыялізацыі прайшоў, як вялікае сьвята сацыялістычнай працы. Раніцаю на заводах рабочых сустракалі з музыкаю. У работах бралі ўдзел жонкі рабочых і пізнэры. Быў арганізаваны вялізарны суботнік, у якім прымалі ўдзел адказныя работнікі, жонкі рабочых і чырвонаармейцы. Прагулаў амаль ня было. На фабрыках прадукцыйнасьць працы павысілася супроць звычайнага на 30 проц.

Тула у фонд індустрыялізацыі дала больш 100 тысяч рублёў.

У дзень індустрыялізацыі **ў Іркуцку** ўсе прадпрыемствы працавалі з вялікім энтузіязмам і посьпехам. Прагулаў амаль ня было. Вылучэньцы, якія працуюць ва ўстановах, калектыўна выехалі ў Чаромухава, дзе працавалі ў капальнях.

У **Вароніжы** рабочыя ўсіх заводаў зьявіліся на работу бяз адзінага прагулу. Рабочымі перадана ў фонд індустрыялізацыі 2 тысячы рублёў заработку. На суботніках на таварнай станцыі разгружана 250 вагонаў. Ня досьць дружна працавалі толькі савецкія і гандлёвыя ўстановы.

Дзень індустрыялізацыі праводзіць кожны год 6 жніўня—

прапануюць рабочыя-чыгуначнікі

6-га жніўня пасьля працы адбыўся агульны вузлавы сход рабочых ст. Менск-таварнай МБВ чыгункі.

У спрэчках па дакладу аб дні індустрыялізацыі выступіў рабочы службы шляху тав. **Клябанаў.**

— Прапаную, — кажа тав. Клябанаў, —абвясьціць дзень 6-га жніўня — днём індустрыялізацыі назаўсёды. Даволі нам лічыць гэты дзень рэлігійным сьвятам. Аднадушна чыгуначнікі падтрымалі прапанову тав. Клябанава.

— З бягучага году кожны год праводзіць дзень індустрыялізацыі 6-га жніўня.

Усьлед за тав. Клябанавым выступіў рабочы вагонных майстэрань **Шнедзель.**

— **Прапаную зьбіраць грошы на пабудову танка.** Мы павінны паказаць усялякім Чан-Кай-шы, што мы заўсёды гатовы абараняць нашу краіну.

1 тав. **Шнедзель** першы ўнёс 5 рублёў. Пад гучныя воплескі яго прапанова была прынята. Зараз-жа была арганізавана падпіска ў фонд пабудовы танка. За паўгадзіны па падпісным лісьце было сабрана 345 рублёў.

Рабочыя парашлі выклікаць усе вялікія прадпрыемствы Беларусі.

С. Г.

Рабочыя-адпускнікі працавалі разам з калектывам

ГОМЕЛЬ, (наш кар.). **У дзень індустрыялізацыі вышлі на работу ўсе рабочыя і служачыя.**

На паасобных прадпрыемствах рабочыя-адпускнікі спынялі свой водпуск і працавалі разам з усім калектывам. На некаторых прадпрыемствах адпускнікі і хворыя рабочыя адпрацуюць у фонд індустрыялізацыі першы дзень свайго выхаду на работу.

Ад рабочых гомельскіх заводаў не адсталі будаўнікі, якія таксама працавалі ў гэты дзень. На некаторых пабудовах пастаноўлена адпрацаваць 11 жніўня ў фонд індустрыялізацыі.

Саматужна-прамысловыя арцелі пастанавілі адпрацаваць у фонд індустрыялізацыі 10 жніўня дзьве гадзіны і 11 жніўня—4 гадзіны.

Калектыў акрфінаддзелу наладзіў нядзельнік па спагнаньні недоімак, па вярбоўцы новых укладчыкаў у касы ашчаднасьці. Некаторыя калектывы наладзілі ў гэты дзень суботнікі па выгрузцы дроў.

15.000 у фонд індустрыялізацыі

Мазыр. (Наш кар.). На ўсіх прадпрыемствах і па ўстановах папярэдня былі праведзены лятучыя мітынгі, агульныя сходы па пытаньні аб дні індустрыялізацыі.

6-га жніўня працавалі амаль усе прадпрыемствы і ўстановы.

Жонкі рабочых фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» прынялі на сваім сходзе пастанову падшукаць работу, каб адпрацаваць на карысьць індустрыялізацыі. З гатай мэтаю, яны (па згодзе з адміністрацыяй фабрыкі) адпрацавалі кожная па адным дню на розных работах, а ўсе зароблены грошы перадалі ў фонд індустрыялізацыі.

Наогул дзень індустрыялізацыі прайшоў з вялікім уздымам. Адпачываў у гэты дзень толькі акраз.

Дзень індустрыялізацыі па Мазыры, па прыблізных падліках, дасьць больш 15.000 руб.

Б. Ш.

Праект англа-эгіпецкага дагавору

ЛЁНДАН, 6. Міністэрства замежных спраў апублікавала прапановы, якія павінны легчы ў аснову англа-эгіпецкага дагавору. Прапановы сфармуляваны ў 16 пунктах: ангельская ваенная акупацыя Эгіпту спыняецца. Паміж Англіяй і Эгіптам заключаецца саюз. Англія абавязуецца падтрымаць хадайніцтва Эгіпту аб прыняцьці яго ў Лігу Нацый. Кожны з бакоў абавязуецца не займаць пазыцый нясумяшчальных з Англа-Эгіпецкім саюзам. Адказнасьць за жыцьцё і маемасьць чужаземцаў у Эгіпце ўскладаецца на эгіпэцкі ўрад. У выпадку вайны Англіі і Эгіпэт дзейнічаюць, як саюзьнікі, і Эгіпэт прадаставіць Англіі ўсе ільготы, у тым ліку права карыстаньня партамі, аэрадромамі і шляхамі зносін. Калі для эгіпэцкай арміі патрабуюцца чужаземныя інструктары, дык такімі інструктарамі павінны быць ангельскія афіцэры. Патрэбныя для аховы Суэцкага каналу ангельскія ваенныя сілы павінны знаходзіцца ў мясцовасьцях, што ляжаць на ўсход ад 32 градусу ўсходняй даўжыні. Чужаземныя чыноўнікі, якія знаходзяцца на службе ў эгіпэцкага ўраду, павінны быць, як агульнае правіла, ангельскімі грамадзянамі. Англа-Эгіпэцкі дагавор заключаецца на тэрмін 25-ці год. (ТАСС).

ЛЁНДАН, 6. Агенцтва Рэйтэр паведамляе:

«З перапіскі паміж Гендэрсонам і эгіпэцкім прэм'ерам Махмуд-пашою вынікае, што пасьля ўрэгуляваньня англа-эгіпэцкіх адносін, эгіпэцкая армія будзе навучацца і ўзбройвацца па ангельскаму ўзору. Эгіпэцкі ўрад мае намер часова захаваць ангельскіх фінансавых і судовых дарадцаў у Эгіпце. На чале гарадзкой паліцыі ў буйных эгіпэцкіх гарадох у працягу яшчэ прынамсі пяці год будуць стаяць ангельскія афіцэры. Гендэрсон лічыць, што перадача на разгляд мяшаных судоў некаторых спраў, якія зараз разглядаюцца на падставе капітуляцыі ангельскімі судамі, павінна залежыць ад волі тых, хто спрачаецца.

Магутныя дэманстрацыі 1 жніўня у Чэха-Славакіі

Буржуазія патрабуе ліквідацыі кампартыі

ПРАГА, 6. Паступова высьвятляецца, што ня гледзячы на ўсе стараньні паліцыі, Чырвоны дзень у Чэха-Славакіі быў адзначан шматлікімі маніфэстацыямі. У Празе па некаторых вуліцах быў абвешчаны стан аблогі. У прамысловых гарадох Паўночнай Чэхіі адбыліся магутныя маніфэстацыі з якімі паліцыя не магла справіцца. Асабліва магутныя дэманстрацыі адбываліся ў Прыкарпатскай Украіне, у прыватнасьці ва Ужгорадзе. Газэты пішуць ужо аб маючым адбыцца «працэсе монстр»—183. Камуністы Лешаль абвясьціў галадоўку з моманту свайго арышту...

***

Жорсткая кампанія ўсяго буржуазнага друку Чэхаславакіі супроць кампартыі ня спыняецца і пасьля Чырвонага дня. Клерыкальныя газэты рэкамэндуюць ураду прыступіць да плянамернай ліквідацыі кампартыі.

Першажнівеньскія дэманстрацыі—палітычная перамога камуністычнага руху

БЭРЛІН, 6. «Ротэ Фанэ», падагульваючы вынікі дня першага жніўня, падкрэсьлівае, што палітычная перамога, атрыманая ў гэты дзень камуністычным рухам зьяўляецца непасрэдным вынікам майскіх рэвалюцыйных баёў. Газэта піша: «У адзэй толькі Нямеччыне партыі ўдалося вывесьці на вуліцу сотні тысяч рабочых пад лёзунгам барацьбы супроць імпэрыялізму і за абарону СССР. Гэта адзначае ўздым рэвалюцыйнай хвалі ў Нямеччыне».

У заключэньне газэта зазначае, што 11-га жніўня (дзень сьвяткаваньня нямецкай канстытуцыі) нямецкі пралетарыят павінен дэманстраваць сваю няпрымірымую варожасьць да буржуазнай «рэспублікі эксплёататараў» і сваю гатоўнасьць да барацьбы супроць «дэмакратыі забойцаў». (ТАСС).

1-га жніўня ў Баўгарыі

ВЕНА, 6. Баўгарская «Свободная Речь» поўнасьцю адхіляе афіцыйныя цьверджаньні аб тым, што дзень 1-га жніўня прайшоў у Баўгарыі без усякага парушэньня парадку. Як паведамляе газэта, у рабочых кварталах Софіі былі вывешаны чырвоныя сьцягі; на ўсім горадзе, у тым ліку і ў вайсковых казармах, распаўсюджваліся праклямацыі. Адбыўся рад мітынгаў, якія разганяліся паліцыяй, зроблена некалькі сот арыштаў. У Католена баставалі рабочыя дрэваапрацоўшчыкі.

За артыкулы аб Чырвоным дні—многія годы турмы

ПАРЫЖ, 6. За зьмяшчэньне артыкулу аб чырвоным дні рэдактар часопісі «Энтернацыонал Комюнік» Кальсэн прыгавораны да двух год турмы і штрафу ў 3.000 франкаў. Барбэ прыгавораны да 5 год і да штрафу ў 5.000 франкаў. Рэдактар «Авангарда» Шакюі прыгавораны да аднаго году і штрафу ў 2.000 франкаў. Два прадаўцы «Авангарда» прыгавораны да 6 месяцаў кожны. Блёндэ да 4 мес. (ТАСС).

Польска-румынскія адносіны

ВАРШАВА, 5. Румынскі пасланьнік у Варшаве Давіла, які атрымаў назначэньне ў Вашынгтон, прыняў перад ад'ездам журналістых, у гутарцы з якімі падкрэсьліў салідарнасьць румынскай і польскай палітыкі ў адносінах да СССР.

Наперакор гэтым заявам вячэрняя газэта з нездавальненьнем адзначаюць, што румынскі ўрад перадаў заказ на паравозы ня Польшчы, а Нямеччыне, хоць польскія заводы прапанавалі самыя нізкія цэны і пяцігадовы крэдыт.

АДКРЫЛАСЯ ГААГСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ

Імпэрыялістычныя акулы зьехаліся, каб дагаварыцца аб умовах вайны супроць СССР

ГААГА. 6-га жніўня адкрылася Гаагская канфэрэнцыя, на якой прадстаўлены 12 дзяржаў: Францыя, Англія, Нямеччына, Італія, Японія, Чэха-Славакія, Юга-Славія, Польшча, Румынія, Грэцыя і Партугалія. У ліку дэлегатаў — Брыян, Штрэзэман, Гэндэрсон, Брандзі, Залескі, Вэнізелос (грэцкі прэм'ер) і Цітулеску — румынскі пасланьнік у Лёндане, былы міністар замежных спраў.

Канфэрэнцыя была адкрыта прывітальнай прамовай галяндзкага міністра замежных спраў Ван - Блёклянда, які заявіў, што галяндзкі ўрад «рады прымаць у сваёй краіне дзяржаўных дзеячоў, што сабраліся ў мэтах арганізацыі міру». На прывітальную прамову Ван-Блёклянда першым, яка загадзя было ўмоўлена, адказаў Брыян, выказаўшы ўпэўненасьць у посьпеху канфэрэнцыі.

Пасьля Брыяна выступіў Штрэзэман, які падкрэсьліў, што Гаагская канфэрэнцыя служыць задачам арганізацыі ўсеагульнага міру і яе значэньне далёка выходзіць па-за межы фінансавых разьлікаў. Адзначыўшы, што «эканамічныя вынікі канфэрэнцыі павінны пацягнуць за сабой і палітычныя вынікі, Штрэзэман выказаў думку, што ў бліжэйшым будучым павінна адбыцца сусьветная эканамічная канфэрэнцыя, якая зоймецца рацыяналізацыяй сусьветнае гаспадаркі». Адзначаючы шляхі гэтай «рацыяналізацыі» Штрэзэман, між іншым, сказаў:

«Цяпер з усьмешкай успамінаюць аб тым пэрыядзе, калі Нямеччына была падзелена на рад дробных дзяржаў, адцяленых адна ад другой мытніцкімі перашкодамі і рознымі манэтнымі сыстэмамі; трэба спадзявацца, што наступіць час, калі з такой-жа ўсьмешкай будуць успамінаць аб цяперашнім стане Эўропы, якая напамінае ранейшы стан Нямеччыны».

Пасьля Штрэзэмана выступіў з прывітаньнем Сноўдэн. Трэба адзначыць, што калі ўдзельнікамі канфэрэнцыі бурна віталіся прамовы Брыяна і Сноўдэна, прамова Штрэзэмана была сустрэчана маўчаньнем. Пасьля прамовы Сноўдэна пасяджэньне закрылася. (ТАСС).

***

БЭРЛІН, 6. Як падаюць бэрлінскія палітычныя колы, прадстаўнікі малых дзяржаў на Гаагскай канфэрэнцыі будуць удзельнічаць толькі ў пленарных пасяджэньнях і ў рэпарацыйнай камісіі канфэрэнцыі, тады, як у палітычнай камісіі будуць удзельнічаць толькі прадстаўнікі 6 галоўных зацікаўленых дзяржаў (г. зн. Англіі, Францыі, Італіі, Бэльгіі, Японіі і Нямеччыны). (ТАСС).

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ РЭПАРАЦЫЙНЫХ ПЛАЦЯЖОЎ У НЯМЕЧЧЫНЕ

БЭРЛІН, 4. Зараз у буржуазным друку разгарэлася спрэчка па пытаньні аб удзеле рабочае клясы і прадпрыемцаў у цяжкасьцях, зьвязаных з плянам Юнга. Орган цяжкай індустрыі «Дэйча Альгемэйнэ Цэйтунг» высоўвае ідэю рэпарацыйнай ягоды паміж рабочымі і прадпрыемцамі. Аўтар выказвае ўпэўненасьць у тым, што «і рабочыя і прадпрыемцы ў пытаньні аб рэпарацыях зыйдуцца за адным сталом».

Капіталістыя аднак не скрываюць таго, што галоўную цяжкасьць плацяжоў яны перакладуць на працоўныя масы Нямеччыны. Дэпутат Рэйстагу Хінцман на сходзе, скліканым народнай партыяй у Гамбургу, заявіў, што пастановы Гаагскай канфэрэнцыі па рэпарацыйным пытаньні павінны паслужыць сыгналам да перагляду ўмоў супрацоўніцтва народнай партыі з сацыял-дэмакратамі. Калі згода па пытаньнях гаспадарчай, фінансавай і падаткоўай палітыкі ня будзе дасягнута, дык — па думцы Хінцмана няўнікнёны роспуск рэйстагу.

Капіталістыя яшчэ загадзя пярэджваюць, што яны зусім не намераны браць на сябе цяжкасьць рэпарацыйных плацяжоў.

САПРАЎДНЫЯ МЭТЫ ГААГСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

Як вядома з тэлеграм, паданых вышэй, 6 жніўня ў Гаазе адкрылася новая канфэрэнцыя буржуазных дзяржаў. На мове дыплёматаў яна называецца канфэрэнцыяй па пытаньні аб нямецкай ваеннай кантрыбуцыі і аб ачышчэньні Рэйнскай вобласьці.

Больш двудушныя кіраўнікі капіталістычнага сьвету называюць яе канфэрэнцыяй па... канчатковай ліквідацыі ўсіх вынікаў вайны. Зразумела, ніводная з гэтых назваў не адпавядае сапраўдным задачам канфэрэнцыі.

У чым-жа справа?

Справа заключаецца ў тым, што капіталістыя імкнуцца прымірыць або зьмягчыць галоўнейшыя супярэчнасьці паміж капіталістычнымі дзяржавамі на глебе толькі што распрацаванага «пляну Юнга». Як вядома паводле гэтага пляну Нямеччына атрымлівае скідку са сваіх штогодных плацяжоў у кошт ваеннай кантрыбуцыі, прыблізна ў 500 мільёнаў марак у год. Сем галоўнейшых капіталістычных дзяржаў, у тым ліку і Нямеччына, стваракоць у мэтах палягчэньня ўзаемных крэдытаў асобны, гіганцкі па сваіх разьмерах банк пад назвай «звыш-банк» з асноўным капіталам у 100 мільёнаў долараў і з магчымым штогоднім зваротам у некалькі дзесяткаў мільярдаў долараў.

Вось гэты-то банк, дзякуючы мяркуемаму, небываламу да гэтага часу цеснаму аб'яднаньню інтарэсаў фінансавага капіталу розных краін павінен, па думцы яго творцаў, прывесьці да зьмягчэньня імпэрыялістычных супярэчнасьцяй. Аднак з аднаго боку **некаторае «примирение» паміж магутным амэрыканскім капіталам і Эўропай у цэлым, а з другога боку — прыяцельскае зблiжэньне паміж Францыяй і Нямеччынай,** калі пасьля канчатковага прыняцьця «пляну Юнга» францускія імпэрыялістыя вывядуць свае войскі з Рэйнскай вобласьці.

На практыцы гэта азначае нішто іншае, як **спробу кіраўнікоў буржуазнага сьвету разьвязаць сабе рукі для пачатку самага жорсткага наступленьня капіталу на рабочую клясу шляхам зьніжэньня заработнай платы і павялічэньня рабочага дня.** Недарма Брыяны, Макдональды і Мюлеры назначылі склік гэтай канфэрэнцыі на другі-жа дзень пасьля першажнівеньскай міжнароднай чырвонай дэманстрацыі, якая выкрыла так выразна магутную клясавую спайку сусьветнага пралетарыяту і яго гатоўнасьць да бою.

Гаагская канфэрэнцыя мае для нас вялізарнае значэньне яшчэ і в другога пункту погляду. **На ёй, у гэтым няма ніякага сумненьня, гутарка будзе ісьці аб цане, за якую капіталістычная Нямеччына згадзілася-бы ўзяць удзел у адзіным антысавецкім фронце.**

Нямецкія сацыял-згодніки атрымалі скідку з кантрыбуцыйных плацяжоў, але **Рэйнскую вобласьць англа-францускія імпэрыялістыя згаджаюцца ім вярнуць толькі пры ўмове, калі Нямеччына канчаткова далучыцца да агульнага антысавецкага фронту.**

Аб гэтай важнейшай задачы капіталістычнага сьвету Брыяны гаварылі ўжо 3 месяцы таму назад, калі ў Парыжы яшчэ толькі распрацоўваўся славуты плян Юнга. Пэўныя пазыцыі немецкай буржуазіі і **асабліва яе сацыял-фашысцкія дапаможнікі ня супярэчылі супроць эдзелкі, а толькі патрабавалі большай цаны.** Зараз на канфэрэнцыі ў Гаазе пытаньне будзе пастаўлена ўжо на дзелавую глебу, якая забясьпечыць канчатковую згоду.

Вось чаму працоўныя масы СССР павінны ўважліва сачыць за падзеямі ў Гаазе. **Правадыры капіталу будуць дагаворвацца там не аб «ліквідацыі вынікаў» старой вайны, а наадварот, аб умовах новай вайны супроць краіны Саветаў.**

Разбой на К.-Усх. чыгунцы ня спыняецца

АРЫШТЫ САВЕЦКІХ СЛУЖАЧЫХ

Чуткі аб перагаворах паміж Кітаем і СССР --беспадстаўны

Заява т. Мельнікава карэспандэнту Роста

ЧЫТА, 6. Карэспандэнт Роста меў гутарку з т. Мельнікавым адносна чутак, якія пашыраюцца кітайскім і японскім друкам, аб маючай нібы адбыцца яго сустрэчы з былым паверным у справах Кітая ў СССР з Чжу Шао-янем. Усе гэтыя чуткі, заявіў т. Мельнікаў, пазбаўлены ўсякае падставы. Пасьля перадачы Цаю лісту т. Карахана, у якім паданы пункт погляду савецкага ўраду, я адхіляў усе меўшыя пасьля гэтага месца новыя пробы пана Цая, каб спаткацца са мной. Сёньня я атрымаў перададную з 86-га раз'езду тэлеграму Цая, у якой паведамляецца, што на станцыю Манчжурыя прыбывае Чжу Шао-ян, які просіць мяне спаткацца з ім для перадачы мне афіцыяльнага паведамленьня Нанкінскага ўраду. Я безадкладна паслаў адказ, што я не ўпаўнаважаны спаткацца з Чжу Шао-янем і што калі ў апошняга ёсьць афіцыяльнае пісьмовае паведамленьне ад Нанкіну, дык ён можа перадаць яго на 86-ты раз'езд, або па тэлеграфу. Тав. Мельнікаў паехаў сёньня ў дазволены яму водвуск. (ТАСС).

Разгалосьсі паміж Нанкінным і Мукдэнам

ПЭЙПІН, 6. Ангельскі орган «Пекін энд Цян-Цзінь Таймс» дапушчае, што японскія колы маюць рацыю, сьцьвярджаючы, што Мукдэн рашыў урэгуляваць канфлікт з-за К. Усх. Ч. без усякага ўдзелу Нанкіну. Справа ў тым, што Мукдэн баіцца пашырэньня ўплыву Нанкіну на Манчжурыю і не жадае дзяліць даходы ад К. Усх. Ч. з Нанкінам. Газэта лічыць, што мукдэнцы па цэламу раду прычын зацікаўлены ва ўрэгуляваньні канфлікту ў самы кароткі тэрмін. (ТАСС).

Арышты савецкіх служачых

ТОКІЁ, 6. «Токіё Асахі» паведамляе з Харбіну, што там зноў арыштаваны 30 савецкіх служачых (па іншых вестках арыштавана звыш 130 чалавек). (ТАСС).

Заява Ван Чжэн-ціна

ШАНХАЙ, 6. Агенцтва Гомінь перадае наступную заяву міністра замежных спраў Нанкінскага ўраду Ван Чжэн-ціна: мяркаваньне, што СССР выставіць патрабаваньне да адкрыцьця афіцыйных перагавораў апраўдалася. Сапраўды Мельнікаў нібы дамагаўся неабходнасьці звароту назад кіраўніка К.-Усх. чыгункі. Аднак згадзіцца з умовамі, выстаўленымі СССР да адкрыцьця нармальных перагавораў нельга. Нанкінскі ўрад неаднакрацьь заяўляў, што здаваленьне падобных патрабаваньняў можа наступіць толькі ў выніку перагавораў.

Далей Ва Чжэн-пін заявіў, што ў гэтым канфлікце трэба разглядаць інтарэсы Кітая ў цэлым, а ня толькі інтарэсы Манчжурыі.

***

ТОКІЁ, 6. Па вестках газэт, міністэрства замежных спраў нанкінскага ўраду пастанавіла адхіліць патрабаваньні Савецкага ўраду аб аднаўленьні савецкіх супрацоўнікаў К.-Усх. чыгункі і жадае пачаць перагаворы бяз гэтай папярэдняй умовы.

ПЭЙПІН, 7. «Цян-Цьдзін 1-Шы-Бао» дамагаецца, каб нанкінскі ўрад і далей займаў цьвёрдую пазыцыю ў адносінах да СССР.

Газэта жа «Цяньцзін Такун-бао» піша, што сучаснае становішча на К.-Усх. чыгунцы ня так складанае, бо Кітай ня мае намераў захапіць правы СССР на К.-Усх. чыгунцы. Значна больш важным для Кітая зьяўляецца пытаньне аб аднаўленьні дыплёматычных адносін.

Напады хунхузаў

**ХАБАРАЎСК, 4. З Іману паведамляюць, што ў апошні час у некаторых паселішчах раёну пачасьціліся вып

Генэральная праверка і чыстка вясковых парт'ячэек

прысьпешыць тэмп сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі

Кожная вясковая ячэйка павінна стаць сапраўдным пачынальнікам, кіруючым штабам у будаўніцтве новых калектыўных гаспадарак

Шырэй разгарнуць барацьбу супроць апартуністых, якія здаюць клясавыя пазыцыі пралетарыята кулаку

Там, дзе практычная работа адставала ад палітычных задач

ЯЧЭЙКІ НЕ КІРАВАЛІ РАЗЬВІЦЬЦЁМ КАЛГАСАЎ І САЎГАСАЎ. У АРГАНІЗАЦЫІ НЕ ВЯЛІ ЖОРСТКАЙ БАРАЦЬБЫ СУПРОЦЬ ПРАЯЎ ПРАВАГА ЎХІЛУ Ў ПРАКТЫЧНАЙ РАБОЦЕ.

(Пухавіцкая партарганізацыя, Меншчына)

Пухавіцкая арганізацыя правяла вялікую палітычную работу па падрыхтоўцы да чысткі партыі. Раённы камітэт свячасова выпрацаваў усе памылкі ячэек у падрыхтоўчай рабоце. Склікаліся сходы батрацтва і вясковай беднаты. Усе прапагандыстыя былі накіраваны ў вёскі для правядзеньня агітацыйна растлумачальнай работы. Некаторыя ячэйкі выдавалі спэцыяльныя насьценгазэты, прысьвечаныя пытаньням чыстки партыі. Арганізацыя абудзіла актыўнасьць мас, мабілізавала грамадзкую думку. Дзякуючы гэтаму праверачныя сходы прахадзілі пры актыўным удзеле с.-г. рабочых, батракоў і сялян-беднякоў. На сходы прыходзілі сотні і тысячы працоўных. Кулацтва імкнулася выкарыстаць чыстку ў сваіх інтарэсах. Для дыскрэдытацыі перадавых камуністых кулакі мабілізавалі цёмных антысавецкіх асоб, якія пісалі дзесяткі хлусьлівых паклёпніцкіх заяў. Сотні батракоў і беднякоў выступілі супроць кулакоў і падкулачнікаў. Бедната дыскрэдытавала кулацтва, адпадушна патрабавала выдаленьня кулакоў са сходаў.

Праверачныя сходы яскрава паказалі, якое магутнае давер'е партыі аказваюць бяднацка-серадняцкія масы вёскі. Чыстка ўскалыхнула арганізацыю, ажывіла работу ячэек, прыблізіла батрацтва і беднату да партыі.

Чыстка паказала, што арганізацыя ня выканала асноўнай дырэктывы. За апошнія гады арганізацыя зусім не расла. У раёне ёсьць пэўныя кадры для росту ячэек. У саўгасах, калгасах, камунах працуе вялікая армія с.-г. рабочых і камунараў. Сотні батракоў, рабочых фабрыкі імя Леніна і чыгуначных станцый складаюць невычарпальныя рэзэрвы для росту арганізацыі. Але... ячэйкі не займаліся пытаньнямі росту. Ячэйкі забылі, што яны павінны праводзіць культурна-выхаваўчую работу сярод сялянства. І батракі, і с.-г. рабочыя ня ішлі ў партыю таму, што ў ячэйках чыгуначнай станцыі, фабрыкі імя **Леніна**, саўгасу **«Вялень»** панавала г'янства. Партыцы п'янствавалі, замест таго каб праводзіць культурна-выхаваўчую работу. У **Шацкай** і іншых ячэйках было склочніцтва, агідныя, абываталскія плёткі... Усё гэта перашкаджала росту арганізацыі. Частка ячэек, якія дыскрэдытавалі сябе п'янствам, скажэньнем клясавай лініі, распустай сваіх членаў, грубасьцю, адсутнасьцю культурнай работы, склочніцтвам щукала прычын слабага росту ў аб'ектыўных умовах работы. Камуністыя гэтых ячэек заяўлялі аб тым, што няма за лік каго расьці і г. д. Адна ячэйка нават высунула такую нячувана ганебную тэорыю: «Навошта ўцягваць у партыю батракоў. Потым прыйдзецца яшчэ ім даваць работу...»

Арганізацыя правяла відавочную работу па калектывізацыі вёскі. **Арганізавана 9 камун і калгасаў.** Калектывы праводзяць агрыкультурную работу сярод сялянства. Але... ячэйкі не замацавалі дасягнутых посьпехаў. У пагоні за вольласным ростам калгасаў арганізацыя забыла аб неабходнасьці стала кіраваць арганізаванымі калектывамі. **Ячэйкі ня дацяклівіліся ўнутраным жыцьцём калгасаў і іх эканамічным станам.** У арганізацыі панавала ўпэўненасьць, што ў камунах і калгасах усё добра. А ў сапраўднасьці ча шырмай спакою хаваліся факты, аб якіх трэба было сыгналізаваць, на якія трэба было рашуча і безадкладна рэагаваць.

Асобныя калгасы скажалі клясавую лінію і трымалі цесную сувязь з кулацкімі элемэнтамі. Калгаскія ячэйкі аднадушна галасуючы за пастановы XVI партканфэрэнцыі, на справе не рэагавалі на канкрэтныя правявы правага ўхілу, на прымірэнцтва. У калгас імя **Чарвякова** пралезьлі шкодныя антысавецкія элемэнты, былыя спэкулянты і г. д. Савет калгасу спакойна прайшоў міма гэтага факту. Калгас, які быў засьмечаны спэкулянтамі, нічога не зрабіў на калектывізацыі местачковай яўрэйскай беднаты. Нацыянальны калгас «Піці» таксама засьмечаны варожым элемэнтамі. Калгасы, у якіх не хапае рабочай сілы для апрацоўкі ўласнай зямлі, займаюцца арэндай, на практыцы скажаюць правільную лінію ў пагоні за лішнім прыбыткам. Раённы камітэт ня ўважліва адносіўся да гэтых фактаў, не ўзмацніў яўрэйскія калгасы партыйцамі. Камуна **«Зьвязда»**, дзе ёсьць адна з самых лепшых у раёне ячэек падтрымлівала цесную сувязь з мясцовымі кулакамі. Камуна брала ў кулакоў грошы ў крэдыт пад вялікія процанты. Члены ячэйкі камуны, у большасьці вытрыманыя камуністыя, ня бачылі нічога дрэннага ў тым, што камуна карысьтаецца дапамогай клясавага ворага і праводзіць грашовыя апэрацыі з антысавецкімі элемэнтамі. Камуна ізалявалася ад беднаты. Ваколічнае батрацтва і сялянне-беднякі імкнуцца ўступіць у камуну, падаюць дзесяткі заяў аб прыняцьці ў члены. Савет камуны розными манэўрамі зацягваў прыём новых членаў. Так, на справе агітавалі камунары-партыйцы камуны «Зьвязда» за разгортваньне калектывізацыі, за бязьлітасную барацьбу з кулакамі.

У раёне арганізаваны 9 вытворчых таварыстваў. З афіцыйнага боку арганізацыя пасьпяхова выконвае адну з важнейшых задач па сацыялістычнай перабудове вёскі. На справе таварыствы засьмечаны заможнымі і кулацкімі элемэнтамі. Заможнікі праводзяць адпаведную агітацыю і перашкаджаюць разьвіцьцю арцеляй і таварыстваў у вышэйшыя формы камун і калгасаў. Які вывад можна зрабіць з гэтых фактаў? **Партарганізацыя невыстарчальна кіравала калгасамі, камунамі і арцелямі. Ячэйкі слаба рэагавалі на скажэньні клясавай лініі і канкрэтныя праўленьні правага ўхілу ў практычнай рабоце калектываў і вытворчых аб'яднаньняў.**

Культурна-масавая работа сярод партыйцаў і беспартыйных саўгаскіх рабочых заняпала. Ячэйкі не праводзілі ніякай антырэлігійнай прапаганды ў той час, калі клерыкальныя папоўскія элемэнты разьвілі ўзмоцненую рэлігійную агітацыю. У саўгас **«Любін»** спэцыяльна прыяжджае поп для правядзеньня рэлігійнай прапаганды сярод саўгаскіх рабочых. Поп абходзіць кватэры рабочых, заводзіць з работніцамі гутаркі на рэлігійныя тэмы і г. д. Мясцовыя камуністыя спакойна адносяцца да гэтага факту. Там, дзе клясавы вораг умее скарыстаць усе магчымасьці для правядзеньня сваёй шкодная агітацыі, там партыйцы не маглі разгарнуць выстарчальнай культурна-масавай работы, не маглі наладзіць **палітычнага выхаваньня** беспартыйных рабочых.

Адсутнасьць культмасавай работы, палітычная няпісьменнасьць партыйцаў, слабасьць палітвучобы—самыя асноўныя і небясьпечныя недахопы ў рабоце саўгаскіх партыйных ячэек. І таму, ня дзіва, што асобныя саўгасы скажалі клясавую лінію, мірна сябравалі з кулакамі і спрялялі росквіту кулацкіх гаспадарак. І таму ня дзіва, што ячэйкі, ухваліўшы прыгожыя рэзалюцыі аб барацьбе з правымі і прымірэнцамі, праходзілі міма канкрэтных праяўленьняў правага ўхілу, не змагаліся з апартунізмам на практыцы. Саўгас **«Блонь»** вёў грашовыя апэрацыі з заможнікамі і апрацоўваў саўгаскімі машынамі кулацкую зямлю. **Кіраўніці саўгасу** в радасьцю далі кулаку **Кальперчыку** саўгаскія с.-г. машыны для апрацоўкі яго зямлі. Блоньскія камуністыя ня лічылі гэтыя факты скажэньнем клясавай лініі. Партыйцы, якія шчыра агітавалі за рашучую барацьбу з кулацтвам, на практыцы праводзілі палітыку клясавага міру. Блоньскія камуністыя спакойна аказвалі дапамогу клясавым ворагам і былі ўпэўнены, што ячэйка праводзіць правільную лінію.

Прымірэнцтва, самае адкрытае прымірэнцтва да кулакоў праявіла ячэйка саўгасу **«Блонь»**. Інакш гэты факт ацаніць нельга.

Саўгас **«Вялень» адмаўляў беднаце** ў практычнай дапамозе па апрацоўцы зямлі. Дарма ваколічныя сяляне-беднякі прыходзілі ў саўгас і прасілі дапамогі. С.-г. машыны, плугі стаялі без нагрузкі, але кіраўнік саўгасу не дазваляў скарыстаць іх для дапамогі вясковай беднаце. Што рабілі партыйцы? Як рэагавалі яны на гэты грубы факт скажэньня важнейшай дырэктывы партыі—саўгасы павінны стала і сыстэматычна дапамагаць ваколічнай беднаце ў апрацоўцы зямлі, павышэньні ўраджаю бядняцкіх гаспадарак і г. д. Адказ,—партыйцы маўчалі. Маўчалі таму, што страцілі клясавую чуласьць.

Саўгас **Марынгорскага** с.-г. тэхнікуму гандлюе жывёлай з дапамогаю кулацкіх элемэнтаў. Узоры саўгас, які павінен на канкрэтных прыкладах агітаваць за лепшыя больш культурныя спосабы апрацоўкі зямлі, здае сваю сенажаць у арэнду на нявыгадных для дзяржавы умовах.

Камісія па чыстцы правільна ахарактарызавала такі факт, як яўнае скажэньне клясавай лініі.

Партыя праводзіць напружаную барацьбу за пашырэньне пасеўнай плошчы, за кожны лішні нанава засеяны гэктар зямлі. А асобныя саўгасы раёну нічога не зрабілі на выкананьні гэтай баявой задачы. У саўгасе **«Гаўрылаўка»** сотні гэктараў добраякаснай зямлі зараслі травой. Вялічэзная зямельная плошча зусім не скарыстоўваецца. Саўгаскія камуністыя не праявілі працоўнага энтузіязму, не змагаліся з скажэньнямі клясавай лініі, невыстарчальна праводзілі на практыцы лінію партыі на разгорнутае сацыялістычнае наступленьне. Саўгаскія камуністыя ня былі сапраўднымі актыўнымі ўдзельнікамі сацыялістычнай перабудовы вёскі.

І гэта вялікі палітычны мінус у рабоце **Пухавіцкай** партыйнай арганізацыі.

Ячэйкі аднадушна асудзілі капітулянцкія тэорыі правых і заявілі аб сваёй **поўнай гатоўнасьці змагацца з апартуністымі і прымірэнцамі за выразнае правядзеньне генэральнай лініі.** Але асобныя члены арганізацыі адкрыта выступалі в праваўкланісцкімі тэорыямі з паклёпніцкімі заявамі супроць калектывізацыі. Асобныя «камуністыя» сябравалі з клясава-варожымі антысавецкімі элемэнтамі, дапамагалі заможнікам, гандляром, клерыкалам. Партыец **Баравік** рашуча адмовіўся праводзіць работу сярод беднаты і агітаваў за тое, што гэтая работа зьяўляецца шкоднай. Падкулачнік, які пад шыльдай партыйца прапагандаваў за ідэалы кулацтва, атрымаў аднадушны адпор з боку ячэек. Да рэчы гэты самы «партыец» катэгарычна адмовіўся ісьці ў калгас. Увогуле работа з беднатой праводзіцца зусім дрэнна. Партыйцы ня зусім добра зразумелі задачы партыі па гаспадарча-палітычнай арганізацыі беднаты. І таму асобныя камуністыя праяўляюць ідэалёгічныя хістаньні ў гэтым пытаньні і адкрыта выступаюць супроць правядзеньня работы сярод бядняцкіх мас вёскі. У далейшым арганізацыя павінна **ўзмацніць ідэёвую барацьбу з скажэньнямі клясавай лініі ў рабоце калгасаў, камун і саўгасаў і канкрэтнымі праявамі правага апартунізму і прымірэнцтва сярод сваіх членаў.** Вынікі чыстки наступныя: з 185 членаў арганізацыі 18 выключаны з партыі.

Перадавыя с.-г. рабочыя, батракі і беднякі актывістыя сталі падаваць заявы аб прыняцьці ў рады КП(б)Б.

ЮРЫ Т—К.

Некалькі момантаў з практыкі чыстки

(ПОЛАЧЧЫНА)

Чыстка ў Полацкай акруговай парт-арганізацыі ўжо закончылася па 7-мі раёнах. Толькі ня скончана яшчэ па Валынецкім і Полацкім раёнах, у якіх работа па чыстцы праведзена напалову. Вайсковых ячэек праверана 80 проц. агульнай колькасьці, у некаторых арганізацыях падведзены вынікі чысткі. Як-жа праходзіла практычная работа па чыстцы ячэек? Перш за ўсё трэба паказаць на тое, што некаторыя райкомы няўважліва аднесьліся да справы дапамогі праверачным тройкам у іх рабоце. Гэта выявілася ў Вушацкім і Ветрынскім раёнах. Камсамольская арганізацыя прымала вельмі слабы ўдзел у чыстцы, амаль па ўсіх раёнах, акрамя Вульскага. На праверачных сходах мала прысутнічала камсамольцаў.

Удзел беспартыйных мас у чыстцы быў у асноўным досыць добры. Праўда, у асобных мясцох беспартыйныя, дзякуючы таму, што з боку партыйных арганізацый ня было праведзена належнай падрыўтоўчай работы, удзельнічалі ў чыстцы слаба. Гэта мела месца на Лепельскім раёне, дзе РК ня выканаў дырэктывы АК і АКК аб папярэдняй пасыцы прадстаўнікоў РК у ячэйкі з мэтай пастаноўкі арганізацыйнай работы. У Валынецкім раёне былі сарваны два праверачныя сходы з тэй прычыны, што насельніцтва ня было ў выстарчальнай меры падрыхтавана да чысткі.

На ўсіх сходах пры праверцы наглядаўся вялікі ўздым актыўнасьці мас. Гэта актыўнасьць была накіравана на высьвятленьне адмоўных зьявішч у рабоце ячэек. Беднота, батракі, згуртаваныя наўкола ячэек, былі на чале гэтай актыўнасьці.

Беднота і батракі давалі характарыстыку партыйцам, якія праявяліся. Пры яе дапамозе камісія выкрыла ў ячэйках чужыя элемэнты, тых, што скажаюць лінію партыі, якія трымаюць сувязь з кулацтвам.

Заможныя падкулачнікі імкнуліся скарыстаць чыстку для кампрамэтацыі партыі і наасобныя камуністых. У Асьвейскім раёне кулацтва з'агітавала бяднячку-удаву, якая выступіла на праверачным сходзе супроць калектывізацыі. У Кахановіцкай ячэйцы заможныя прыяжджалі з іншых сельсаветаў на конях, каб выступіць супроць судзьдзі-камуністага, які іх судзіў за спэкуляцыю хлебам.

Па некаторых ячэйках меліся спробы наскоку на асобных партыйцаў шляхам падачы кампрамэтуючых заяў асобамі, пазбаўленымі выбарчых праў.

Праявы зажыму крытыкі і самакрытыкі ў часе чысткі знаходзілі свой адбітак на цэлым радзе выпадкаў. У Лепельскім раёне партыец-адміністратар забараніў беспартыйным рабочым і асобным партыйцам выступаць на праверачным сходзе. У Вульскім раёне—сярод кіруючага складу наглядаліся ў часе самой чысткі нездаровыя адносіны да селькораў і рабкораў, якія падмячалі адмоўныя бакі работы арганізацыі. Па Расонскім раёне крытыкавалі толькі нізавых работнікаў, кіруючага складу не крытыкавалі, бо баяліся арганізацыйных вываду. Па Ветрынскім раёне—старшыня сельсавету, ён-жа сакратар наўліцкай ячэйкі сваімі выступленьнямі да чысткі і ў часе яе зажымаў крытыку і самакрытыку, беспартыйныя сяляне і партыйцы проста заявілі праверкому, што яны баяцца гаварыць.

Праверкомы ў сваёй рабоце асаблівую ўвагу аддавалі праверцы таго, як ячэйкі і асобныя камуністыя праводзяць клясавую лінію і работу па калектывізацыі. Выяўлена, што моманты скрыўленьня клясавай лініі наглядаліся амаль што на ўсіх правераных раёнах, асабліва па лініі работы крэдытнай каапэрацыі. У Расонскім раёне кіраўнікі крэдытнай каапэрацыі партыйцы за скрыўленьне клясавай лініі атрымалі спагнаньне—два выключаны з партыі, а два атрымалі суровыя вымовы і зьняты з работы.

Пытаньне калектывізацыі яшчэ слаба завострана сярод асноўнай беспартыйнай масы сялянства. Палова ячэек па Расонскім, Ветрынскім і інш. раёнах не праводзіць практычнай работы па калектывізацыі.

Чыстка раённых партарганізацый выкрыла ў цэлым радзе ячэек шмат фактаў разлажэньня, сяброўства з кулацкім і папоўскім элемэнтам.

Л. Б—скі.

3-я пазыка індустрыялізацыі

БССР павінна даць 11.250 т. р.

Даб'емся, каб гэтая сума была рэалізавана ў самы кароткі тэрмін

Задачы кампаніі

—Дзяржаве патрэбны доўгатэрміновы крэдыт.—Ахапіць падпіскай усе 100 проц. членаў саюзаў.—Максымум увагі зьвярнуць на вёску

Нашы пазыкі значна дапамагаюць паскарэньню тэмпу індустрыялізацыі краіны. Але яны выконваюць гэтую ролю толькі ў тым выпадку, калі крэдыт, які атрымліваецца шляхам рэалізацыі пазык, зьяўляецца крэдытам доўгатэрміновым. Невялікую карысьць атрымае дзяржава, калі сродкі пазык прабудуць у дзяржаўнай казне кароткі тэрмін.

Трэба дабіцца таго, каб кожны падпішчык, набываючы аблігацыю 3-й пазыкі, добра ўявіў сабе, што ён пазычае дзяржаве грошы на сацыялістычнае будаўніцтва не на 10 месяцаў, а на значна большы тэрмін.

Гэтага мы зможам дабіцца пры максымальным разгортваньні растлумачальнай работы, калі кожны рабочы і селянін зразумее, якую шкоду прыносіць датэрміновая здача аблігацый.

Важнейшае значэньне ў рэалізацыі мае спаборніцтва калектываў, цэхаў і паасобных рабочых. Зараз мы маем выпадкі, калі ў спаборніцтва ўступаюць не калектывы ў цэлым, а паасобныя рабочыя і служачыя. Прычым некаторыя з іх бяруць на сябе непасільныя абавязкі: пры 50-60 руб. месячнай пэнсіі падпісваюцца на 400-500 руб., між тым у гэтым-жа калектыве часта бывае каля 20 проц. працаўнікоў, зусім не ахопленых падпіскай.

Задача кампаніі, каб падпіска праходзіла галоўным чынам не за кошт павялічэньня падпісной сумы, а за кошт ўцягненьня ў падпіску новых рабочых. Наш лёзунг—«Сто процантаў месячнай зарплаты ў пазыку і сто процантаў членаў прафсаюзаў—падпісчыкаў 3-й пазыкі».

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на рэалізацыю пазыкі ў вёсцы ў сувязі з тым, што вёска да гэтага часу слаба ахоплена пазыкамі, а таксама ў зьвязку з тым, што значная частка сродкаў ідзе на рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

Лёзунг дня «Ніводнага двара без аблігацыі пазыкі».

Трэба прыцягнуць да правядзеньня кампаніі ўсе камісіі садзейнічаньня, грамадзкія арганізацыі, вясковую інтэлігэнцыю.

МІКУЛІЧ
(Наркамфін БССР).

11 млн. 250 тыс.

Падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі па БССР, паводле кантрольных лічбаў, павінна даць 11.250.000 руб. Каля 9 млн. трэба рэалізаваць сярод рабочых і служачых, 1.500.000 руб.—сярод сялянства і 750.000 руб.—сярод неарганізаванага насельніцтва (саматужнікаў, гандляроў і г. д.).

Менск даў 1.400 тыс. руб.

На 7 жніўня падпіска на трацюю пазыку па Менску дасягнула 1.400 т. руб. Па галоўнай касе ашчаднасьці ўжо аформлена заявак на 430 тыс. руб.

Ніводнага двара без аблігацыі

СУРАЖ. (Наш кар.). Агульны сход 3-х вёсак (Сіманы, Пукшына і Данілёнкі) пастанавіў—кожнаму двару падпісацца на 3-ю пазыку і выклікаў на спаборніцтва ўсіх сялян Янавіцкага сельсавету.

Прымем выклік Віцебшчыны

Учора мы паведамлялі, што Віцебская акруговая камісія садзейнічаньня рэалізацыі 3-й пазыкі выклікала на спаборніцтвы Менскую і Гомельскую акругі.

Спаборніцтвы павінны разгортвацца па наступных галінах работы: **ахапіць падпіскай усе 100 проц. рабочых, дасягнуць у падпісцы 100 проц. фонду зарплаты, як мага больш ахапіць неарганізаванае насельніцтва, шырока распаўсюдзіць пазыку на вёсцы.**

Мы павінны прыняць выклік Віцебску.

Сёньня мы зьмяшчаем даныя аб ходзе падпіскі па буйных прадпрыемствах гораду. Гэтыя даныя паказваюць, што ня ўсе калектывы цалкам ахоплены падпіскай, што ўперадзе яшчэ вялікая работа.

Выклік Віцебшчыны прымусіць нас падцягнуцца.

Хто дасьць большую падпіску, хто перавысіць кантрольныя лічбы—Менск ці Віцебск,—пакажа бліжэйшая будучыня. Мы спадзяемся, што працоўныя абодвых гарадоў пакажуць прыклад сьвядомых адносін да свайго клясавага абавязку і дапамогуць хутчэйшай рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі.

Спаборніцтва па падпісцы

— На **чырвонаштандартным заводзе «Энэргія»** з 600 рабочых пакуль што падпісалася 350 чал. Падпіска дасягнула 30 тысяч руб. пры агульным фондзе зарплаты ў 43 тысячы. Такім чынам, каля 60 проц. усіх рабочых далі падпіску на 70 проц. усяго фонду. Вынік вельмі здавальняючы. Перад камісіяй садзейнічаньня стаіць задача ахапіць падпіскай увесь калектыў рабочых на 100 проц. зарплаты. Спадзяемся, што падпіска перавысіць фонд зарплаты ў 43 тысячы руб.

* * *

Чырвонаштандартны «Бальшавік» яшчэ не падлічыў вынікаў па падпісцы. Вядома толькі, што пры фондзе зарплаты ў 70 тысяч рублёў, зроблена падпіскі на 63 тысячы руб. Упэўнены, што «Бальшавік» стане ў першыя рады па падпісцы ў гор. Менску.

* * *

На **заводзе «Чырвоная Зара»** з агульнага ліку 207 чал. падпісалася 172 чал. на 11 тысяч руб. (фонд зарплаты 14 тысяч). Такім чынам падпісалася 85 проц. рабочых на 80 проц. зарплаты.

* * *

Адстае **завод «Камунар».** З 550 чал. падпісаліся 300, прыблізна, на 20 тысяч руб. Фонд зарплаты—55 тысяч руб.

Дзе камісія садзейнічаньня?

Ц.

Хто перагоніць?

(Мапюнкі спаборніцтва ў цэхах)

Хлапец падцягнуў за рукаў старшыню камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту (фабрыка «Чырвоная Вярэзіна») трывожна запытаў:—«Тав. Рагачоў, як гэта так? Чаму нас абганяе матальны цэх»?

Гэта пытаньне хвалюе рабочых прапітачнага цэху, бо матальны цэх кінуў выклік: выходзьце на спаборніцтвы па падпісцы на пазыку!

* * *

Рабочыя т. **Мацюк і Полазаў**, калі пачалося спаборніцтва падпісаліся на невялікія сумы , потым у тры разы павысілі суму падпіскі—ня адставаць-жа ад іншых.

* * *

Прафупаўнаважаны прапанаваў майстру тав Котаву падпісацца, майстар падумаў і адказаў: «пачакай пару хвілін».

Пакуль той чакаў, дзівячыся, чаму так доўга цягне майстар; т. Котаў даведаўся ў камісіі—наколькі падпісаўся т. **Антанюк** з прапітачнага цэху. Аказваецца, тэй падпісаўся на 100 руб. Котаў абагнаў яго і падпісаўся на 150 руб.

Праз гадзіну зьявіўся і Антанюк:—«Падпішэце і мяне на 150 руб. Вытрымаю. Ня страшна»...

* * *

Спаборніцтва усхвалявала цэхі.

— Трэба хутчэй вывесіць дошкі, як ідзе спаборніцтва. Трэба адзначаць рабочых,--якія падпісаліся на пазыку больш, чым на месячны заработак, не забываць і тых, якія цягнуцца ў хвасьце,—прапануюць рабочыя.

Час не чакае.

Е.

Асьветнікі,—у першыя рады!

Цэнтральнае праўленьне саюзу працаўнікоў асьветы БССР зьвярнулася з адозвай да ўсіх асьветнікаў Беларусі.

— Прэзыдыум ЦП саюзу,—гаварыцца ў ў адозьве,—заклікае ўсіх асьветнікаў прыняць самы актыўны ўдзел у папулярызацыі і распаўсюджваньні 3-й пазыкі.

Кожная школа, кожная хата-чытальня, кожная культурна-асьветная ўстанова павінны неадкладна ўзяцца за працу.

Кожны асьветнік павінен паставіць перад сабой задачу—мінімум 100 проц. месячнай пэнсіі на набыцьцё аблігацыі 3-й пазыкі, самая шырокая растлумачальная праца сярод насельніцтва.

Трэба стварыць пры акруговых аддзяленьнях саюзу, групкомах, мясцкомаў і раённых прафорганаў сталыя камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту.

Прэзыдыум ЦП ўпэўнены, што асьветнікі выканаюць свой абавязак перад сацыялістычнай бацькаўшчынай.

? ? ?

Наркамфін і Менакрфа да гэтага часу ніях ня могуць наладзіць зьбіраньня вестак аб падпісцы на пазыку па акругах і раёнах. Ужо прайшло каля месяца з моманту пачатку папярэдняй падпіскі і каля 2-х тыдняў пасьля выданьня дэкрэту аб выпуску пазыкі, а дагэтуль мы ня можам дакладна сказаць, колькі дала падпіска на 3-ю пазыку па БССР.

Е.

5.000 рублёў павінны сабраць ячэйкі МОПР'у

Закупленыя аблігацыі—на карысьць зьняволеных падшэфных турмаў

Менскі акруговы камітэт МОПР'у зьвярнуўся в цыркулярным лістом да ўсіх РК і ячэек МОПР'у Менскай акругі наконт удзелу ячэек **у рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі.**

У лісьце гаворыцца: **«Не павінна быць ніводнага члена МОПР'у, які-б не падпісаўся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі».**

Акрамя таго Менакругком МОПР'у **бярэ на сябе абавязак распаўсюдзіць аблігацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі паміж ячэйкамі МОПР'у гораду і вёскі па калектыўнай падпісцы на 5.000 рублёў.** Гэтыя аблігацыі і выйгрышы ад іх пойдуць **на карысьць палітзьняволеных падшэфных турмаў.**

Менакругком спадзяецца, што вызначаныя для кожнага раёну сумы падпіскі будуць пакрыты з лішкам, што VI канфэрэнцыя МОПР'у Менскай акругі, якая адбудзецца 21-га верасьня, зможа ўжо паднесьці падшэфным аблігацыі на 5.000 руб.

Ц—н.

Вёска--у калектыў

54 сям'і ўвайшлі ў калгасы

(Касьцюковічы, Магілеўшчына).

У глухой цёмнай вёсцы Вішанкі, дзе жыве 64 самастойныя гаспадары, некалькі месяцаў таму назад арганізаваўся калектыў, які аб'яднаў 14 двароў.

Нядаўна Каніцкая парт'ячэйка з мэтай папулярызацыі 5-гадовага пляну разьвіцьця сельскай гаспадаркі, правяла сход у вёсцы Вішанкі. Пасьля дакладу пачалі выступаць і беднякі і сераднякі. Шмат гаварылі аб тым, што перад сялянствам толькі адзіны шлях—шлях калектывам.

Былі вылазкі і заможнікаў, якія выступалі супроць калектывізацыі.

Сход пастанавіў арганізаваць калектыў, у які ўвайсьці ўсёй вёскай. Дагэтуль у калектыў увайшлі 54 сям'і з 64.

10 заможнікаў атрымліваюць зямлю паасобна па норме.

Хомчанка

Баявыя задачы асеньняй пасеўнай кампаніі 1929 году

У зьвязку з надыходзячай асеньняй пасеўнай кампаніяй ЦК УсеКП(б) зьвярнуўся з лістом да ўсіх партыйных арганізацый, у якім зазначае асноўныя задачы пасеўнай кампаніі і задачы ў ёй партыйных арганізацый і шырокіх мас працоўных.

ЦК адзначае, што веснавая пасеўная кампанія зрабіла значны зрух у разьвіцьці вытворчых сіл сельскае гаспадаркі. Дзякуючы правільнай палітыцы партыі і мерапрыемствам савецкай улады, ўдалося ня толькі пакрыць недасеў восені 1928 г., але і пашырыць пасеўную плошчу на 5-6 проц. Такім чынам, сапраўднасьць абвергла заяву правых укланістых аб тым, што быццам сельская гаспадарка ў нас падае.

Дасягнутыя посьпехі, аднак, трэба ня толькі ўмацаваць, але і разьвіваць далей. Тэмп разьвіцьця сельскае гаспадаркі і перабудовы яго на сацыялістычных асновах трэба яшчэ больш узмацніць. Неабходна яшчэ больш разгарнуць мабілізацыю бядняцка-серадняцкай масы супроць кулакоў, якія працягваюць свае спробы сарваць мерапрыемствы савецкай улады на разьвіцьці вытворчых сіл сельскае гаспадаркі.

Трэба ўлічыць памылкі веснавой кампаніі. У ёй наглядаліся скажэньні клясавай лініі пры разьмеркаваньні крэдытаў, машын, пры кантрактацыі, але ня ўсюды было выстарчальнае кіраўніцтва з боку нізавых савецкіх арганізацый, уцягненьне шырокіх мас у кампанію замянялася загадамі; абслугоўваньне калгасаў было невыстарчальнае.

У новай кампаніі галоўную ролю павінны адыграць мясцовыя саветы, зямельныя органы, каапэрацыя і агранамічны пэрсанал. Трэба безадкладна ўмацаваць іх новымі сіламі і аказаць усямерную дапамогу агранамічнаму пэрсаналу ў яго рабоце. На дапамогу кампаніі павінна быць мабілізавана ўся партыйная і савецкая грамадзкасьць.

Важнейшай задачай кампаніі зьяўляецца далейшае ўмацаваньне саюзу рабочае клясы з сялянствам супроць кулака; далей следуюць практычныя задачы: усямернае пашырэньне пасеўных плошчаў азімых, шырокае распаўсюджваньне прасьцейшых агранамічных палепшаньняў, кантрактацыі, арганізацыя прасьцейшых с.-г. таварыстваў. Работа партарганізацый будзе ацэньвацца так, як яны кіруюць у барацьбе за выкананьне гэтых задач.

ЦК напамінае аб неабходнасьці прасачыць за дакладным выкананьнем закону аб с.-г. падатку, асабліва ў адносінах ільгот за пашырэньне пасеваў і палепшаньне гаспадаркі, трэба зьвярнуць увагу на правільнае і поўнае скарыстаньне мясцовых сродкаў і інвэнтару, на работу трактарных калён, на разгортваньне кантрактацыі, на правільнае разьмеркаваньне грашовых сродкаў, што адпушчаюцца вёсцы. Трэба працягнуць шырокае практыкаваньне вытворчых нарад, нарад аграўпаўнаважаных, канфэрэнцый па павышэньні ўраджайнасьці, конкурсаў па сельскай гаспадарцы, шырока асьвятляць у вёсках задачы пасеўнай кампаніі.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на сацыялістычнае спаборніцтва. Вопыт паказаў яго вялізнае карыснае значэньне, між тым яно разгорнута яшчэ слаба. Таму партыйныя арганізацыі павінны прыняць усе захады да разгортваньня спаборніцтва паміж вёскамі, раёнамі, калгасамі і саўгасамі.

На дапамогу вёсцы павінны быць мабілізаваны неабходныя сілы ў горадзе.

АНТ.

ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЯ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСІІ

Натуральна-гістарычныя ўмовы і шпаркі рост інтэнсыўных культур у БССР паказваюць на магчымасьць разьвіцьця паскораным тэмпам прамысловых прадпрыемстваў па апрацоўцы, перапрацоўцы і хаваньні сельска-гаспадарчага сырцу і на разьвіцьцё прадукцыйнае жывёлагадоўлі малочнага і хутка-сьпелага мясного (бэконнага) напрамку.

Дамінуючае месца ў паляводзтве БССР займае бульба, потым ідзе на паўночным ўсходзе лён, травы і на паўдневым-захадзе травы, лён і ў апошнія часы пачынаюць сеяць канопліі, асабліва на тэрыторыях, якія наступаюць у палявое карыстаньне пасьля асушкі балот. Таму галоўнымі відамі прамысловых прадпрыемстваў па пераапрацоўцы прадуктаў паляводзтва зьяўляюцца прадпрыемствы па пераапрацоўцы бульбы—крухмальна-патачныя, дэкстрынныя, вінакураныя заводы, па першапачатковай апрацоўцы ільну і канопель. Вялікія плошчы пад пладовымі расьлінамі і асабліва добрыя кліматычныя ўмовы для разьвіцьця саматужна-ягадных культур і гародніны даюць поўную магчымасьць да разьвіцьця пладова-гародняй прамысловасьці.

Значны процант пасеву траў і корнеклубня-плодаў, а таксама вялікая колькасьць адыходаў ад с.-г. прамысловых прадпрыемстваў зьяўляецца моцнаю падставаю для разьвіцьця жывёлагадоўлі. Прапорцыі інтэнсыўных культур і мясцовыя асаблівасьці паказваюць, што ў сваёй рыначнай частцы сельская гаспадарка БССР перабудоўваецца на таварна-малочную і хуткасьпела-мясную, а таму ў нашых умовах павінны разьвівацца прадпрыемствы па апрацоўцы малака — масларобчыя і сыраварныя заводы і па апрацоўцы мяса, гадоўлы чынам, сьвініны, бэконныя фабрыкі і іншыя падпарадкаваныя прадпрыемствы па скарыстаньні адкідаў жывёлагадоўлі ад асноўнай перапрацоўкі жывёліннае сыравіны.

Немалую ролю ў балянсе народнае гаспадаркі Беларусі павінна займаць яйка-птушніцкая прамысловасьць. Разьвіцьцю гэтай галіны асабліва спрыяе блізкасьць граніцы, значная колькасьць адкідаў ад с.-г. прамысловых прадпрыемстваў, а таксама мясцовыя ўмовы—значная колькасьць вазёр, — спрыяе разьвіцьцю водная птушкі. Таму разьвіцьцю птушніцкіх камбінатаў па адкорме, убоі і замарожваньні птушкі, а таксама арганізацыі збору і сартыроўцы яек для экспарту, на падставе палепшаньня якасьці нашай птушкі шляхам пашырэньня племяннога матар'ялу, ва ўмовах Беларусі павінна быць удзелена асаблівая ўвага.

На падставе пералічаных вышэй умоў у Беларусі павінны мець месца наступныя віды сельска-гаспадарчых прамысловых прадпрыемстваў.

МАЛОЧНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ

Разьвіцьцё гэтай галіны прамысловасьці да 1926-27 году ішло стыхійна і толькі, пачынаючы з 1927-28 году, работа па малочнай прамысловасьці ад стыхійнай пераходзіць да плянавай. Спэцыяльныя капітальныя ўкладаньні разьм

ЛІСТОК РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ІНСПЭКЦЫІ

АПАРАТ—ПАД АГОНЬ КРЫТЫКІ МАС

Там, дзе адсутнічала клясавая лінія

Апарат Менакрфа засьмечаны чужым сацыяльна-варожым элемэнтам

ЯЧЭЙКА КП(б)Б І МЯСЦКОМ У РОЛІ ПАСЫЎНЫХ НАГЛЯДАЛЬНІКАЎ

Пачалася чыстка апарату Менакрфа. Матар'ялы, сабраныя рабочай брыгадай аб рабоце гэтай установы, лішні раз падкрэсьліваюць сваячасовасьць і неабходнасьць праводзімай чысткі.

Апарат засьмечаны чужым антысавецкім элемэнтам. П'янства, злоўжываньні, сувязь з прыватнікамі, бюракратызм, непадпушчальная расхлябанасьць—усё гэта ганебнае недалёкае мінулае—захавалася ў Менакрфа і да сучаснага моманту.

КРЫХУ «ГІСТОРЫІ»

Апарат Менакрфа чысьціца фактычна ўжо на працягу двух год. У свой час у гэтай установе быў выкрыты цэлы «букет» супрацаўнікоў, якія займаліся простым шкодніцтвам, растратамі, пратэкцыянізмам.

Былыя фінінспэктары **Стрыга, Бараўкоў, Рыліца, Петрашкевіч** і інш. трымалі цесную сувязь з прыватным пасрэднікам Гурвічам, які адчуваў сябе ў Менакрфа «сваім чалавекам». Ня больш, ня менш, як 60 проц. **супрацаўнікоў Менакрфа карысталіся грашовымі крэдытамі гэтага спэкулянта.** Затое Гурвічу было вельмі лёгка дабіцца вызваленьня падатку любому гандляру, адтэрміноўкі падатку і г. д.

Менскія гандляры яшчэ і зараз успамінаюць пра гэтыя «добрыя былыя часы», калі за невялікае ўзнагароджаньне Гурвіча яны маглі вызваліцца ад шмат тысяч рублёў падатку.

Гурвіч наладжваў вечарыны для супрацаўнікоў Фінадзелу, арганізоўваў для іх папойкі ў сябе на кватэры, адным словам—«спайка» была вельмі моцная.

НАЧАЛЬНІК, ЯКІ НЕ АДСТАЎ АД СВАІХ ПАДНАЧАЛЕНЫХ

Былы загадчык Менакрфа **Вострыкаў** не адстаў ад падпарадкаваных яму супрацаўнікоў. Пратэкцыянізм самы бессаромны, самы злачынны расквітаў пры Вострыкаве. Апошні рабіў усе сілы, каб абкружыць сябе «сваімі», надзейнымі людзьмі.

На працягу 2-х год Вострыкаў перацягнуў у Менакрфа цэлы рад былых гандляроў, кантрабандыстых, валютчыкаў, крымінальных злачынцаў.

Былы рэвізор **Бараўкоў** (зараз працуе ў Белсельсаюзе) займаўся складаньнем фіктыўных расьпісак, прысвойваньнем даяржаўных сродкаў. Калі, аднойчы бухгальтарам Менакрфа былі выкрыты злоўжываньні Бараўкова, апошні прапанаваў яму хабар.

Кімсьці справа была замазана і пры пераходзе Бараўкова на работу ў іншую ўстанову яму была выдана характарыстыка: «лепшы добрасумленны працаўнік».

Складаньнем фіктыўных расьпісак займаліся і іншыя супрацаўнікі.

Нездаровая атмасфэра ў Менакрфа спрыяла разлажэньню паасобных членаў партыі і камсамольцаў. За сыстэматычнае п'янства быў зьняты з работы сакратар ячэйкі **Петрашкевіч.** Старшыня гандлёва-каанэрацыйнай камісіі **Маўчанскі** растраціў 1.300 руб. з сродкаў камсамольскай ячэйкі. Сакратар ячэйкі Асоавіяхіму **Маленка** прысвоіў і растраціў грошы гэтай арганізацыі.

Многія супрацаўнікі—эпохі Гурвіча і Вострыкава, якія рабілі злачынствы, знаходзяцца яшчэ і зараз у Менакрфа на адказных і неадказных пасадах (Гуліс, Васільеў, Катковіч, Сарокін, Рунец, Матусэвіч і інш.).

«КРУГАВАЯ ПАРУКА»

Наўрад ці ўдалося рабочай брыгадзе высьвятліць усе хворыя зьявішчы ў рабоце апарату Менакрфа. Гэтаму перашкаджала «кругавая парука», арганізаваная супрацаўнікамі. Ня толькі беспартыйныя супрацаўнікі, але і многія партыйцы імкнуліся замазаць ненармальнасьці, адмоўныя бакі ў рабоце ўстановы. Бо і яны самі не бязгрэшныя. Досыць сказаць, што зусім нядаўна быў выключаны з партыі сакратар партыйнай ячэйкі **Шлейфэр,** як чужы элемэнт.

Патрэбна была ўпартая, напружаная праца рабочай брыгады, каб узьняць заслону «благополучия» у Менакрфа і выкрыць усе гэтыя хібы.

ГАНЕБНАЯ СПАДЧЫНА МІНУЛАГА

Чыноўніцтва, бюракратызм, цяганіна пануюць амаль ва ўсіх аддзелах Менакрфа.

Нядаўна рабочы гарбарні «Бальшавік» прышоў у Менакрфа за даведкай. Рабочы зьвярнуўся да супрацаўніка падатковага аддзелу **Прэсмана** (камсамолец—«лёгкі кавалерысты») з просьбай выдаць даведку.

— Я заняты, не перашкаджайце мне працаваць,—быў грубы адказ Прэсмана. З вялікай цяжкасьцю рабочаму ўдалося атрымаць даведку.

Той-жа Прэсман прымусіў сялянку з аднэй далёкай вёскі хадзіць некалькі раз за невялікай даведкай.

Нейкі гр-н **Лявінскі** быў абкладзены фінінспэкцыяй 5-га раёну падаткам, ня гледзячы на тое, што яшчэ 2 гады назад ён выехаў з Менску. Колькі не заяўляла сям'я аб ад'езьдзе Лявінскага—нічога не памагала. Бюракраты зьнялі падатак толькі тады, калі прыехаў сам Лявінскі і заявіў, што «яго ў Менску няма».

А вось яшчэ адзін яркі факт рэдкага бюракратызму.

Старшыня Вузьдзенскага сельсавету **Шапіра** паведаміў Менакрфа аб раптоўнай сьмерці нейкага гр-на **Гімэльштэйна.** Акрфа даручае Шапіры абсьледаваць мамасьць Гімэльштэйна і прыслаць сьпіс спадчыны. Калі сьпіс быў прысланы, ён трапіў да інспэктара па спагнаньні тав. **Лібо.** Апошні «усё пераблытаў» і ў выніку старшыня сельсавету Шапіра абвяшчаецца ўласьнікам маемасьці Гімэльштэйна, аб чым ён апавяшчаецца спэцыяльным адносьнікам. Усё «ў парадку».

Можна падаць яшчэ шмат аналёгічных выпадкаў з багатага бюракратычнага жыцьця Менакрфа. Можна, напрыклад, успомніць пастанову аб зьняцьці недаімкі з платніка «па беднасьці», у той час, калі сам платнік просіць толькі адтэрміноўкі выплаты падатку. Можна паказаць на выпадак сьнісваньня люстэрка коштам у 1½ руб. на фурмана, якому заплацілі 5 руб. і г. д. і г. д.

Рэвізор піша аднойму, перадае ў рэгістратуру, рэгістратура перадае ў экспэдыцыю і... праз 2 дні пісулька перадаецца інспэктару. Між тым ад рэвізора да інспэктара—адлегласьць у некалькі дзесяткаў крокаў. А інспэктар мясцовага падатку **Башкевіч** ухітраецца, нават, пісаць адносіны да супрацаўнікоў, якія сядзяць побач з ім, а потым... тлумачыць сэнс гэтых паперак...

КЛЯСАВАЯ ЛІНІЯ НЕ ДЛЯ ЎСІХ

Вялікі хаос,і непераможная блытаніна панує ў рабоце **па спагнаньні падаткаў.** Аднакі аб плаце ў нядоімачных картках робяцца праз цэлы месяц пасьля выплаты. У выніку—пасылка агентаў на паўторныя спагнаньні—звычайная справа.

Свавольству і грубасьці некаторых агентаў няма канца. Агент **Курганаў** самавольна прыпыняе вывяз маемасьці ў буйнага гандляра **Шнітмана.**

Аб клясавай лініі пры прадстаўленьні платнікам адтэрміновак гаварыць ня прыходзіцца. Для групы па спагнаньні ўсёроўна, з кім яны маюць справу—з рабочым, саматужнікам, ці гандляром, буйным спэкулянтам. Якая розьніца.

Шмат лішняй работы, непатрэбнага марнаваньня часу. Рахункавод **Шыдлоўскі** выпісвае нядоімачныя карткі ў той час, калі нядоімкі гэтыя аплачаны яшчэ з месяцы назад. Што-ж тут дзіўнага, калі Менакрфа гэта будзе каштаваць некалькі дзесяткаў руб. Шмат часу траціць Шыдлоўскі на прыватныя размовы па тэлефону.—Няважна... Супрацаўнік **Паўлоўскі** таксама больш размаўляе з платнікамі, чымся працуе.

Няма каму праверыць, няма каму кантраляваць. Усё «ў парадку».

БЮДЖЭТНАЯ ГРУПА, ЦІ БУХГАЛЬТЭРЫЯ

Ня лепш працуе і **бюджэтная група. Казёншчына, фармалізм, незацікаўленасьць адчуваецца на кожным кроку.**

Замест свайго простага прызначэньня — вывучаць фінансава-эканамічнае становішча Менскай акругі і паасобных бюджэтных устаноў і раёнаў—бюджэтная група займаецца выключна рахункаводзтвам і бухгальтэрыяй, складаньнем справаздач і г. д.

3.000 руб., асыгнаваныя сваячасова Менакрвыканкомам на эканамічна-фінансавае вывучэньне акругі, ляжаць нескарыстанымі і да гэтага часу. Прыбыткі акругі ня вылічаны, адсюль рад памылак і наяўнасьць дэфіцыту ў бюджэце. Бюджэтнай групе няма часу, яна займаецца бухгальтэрыяй.

Хто вінаваты ў дрэннай рабоце бюджэтнай групы? Зразумела, у першую чаргу кіраўнік групы **т. Міронаў.**

ФІНКАНТРОЛЬ, ЯКІ НІЧОГА НЕ КАНТРАЛЮЕ

Кіраўнік фінкантролю **т. Калнін**—малапісьменны, нявопытны працаўнік—слаба спраўляецца з сваімі абавязкамі. Розныя рэвізіі праводзяцца бясплянава, на іх затрачваецца вельмі шмат часу. Кантралёр **Шостак** рэвізуе інспэкцыю працы на працягу... 40 сутак. Вынік рэвізіі—акт з 6 пунктаў. Пісаньне 6 пунктаў працягваецца ў Шостака ня больш, ня менш, як... з дні. Усё, здаецца, ясна.

Быў выпадак, калі новы кантралёр, не праінструктаваны належным чынам, паехаў на рэвізію аднаго раённага камбінату, прабыў там цэлыя суткі і... прывёз матар'ял, які даўно ўжо быў у акрфа.

Гадавы плян рэвізій звычайна выконваецца фінкантролем са спазьненьнем на 2 месяцы...

У ЧЫМ КОРАНЬ ЗЛА?

Такая цяжкая спадчына мінулага Менакрфа. Спадчына бюракратызму і цяганіны, расхлябанасьці і нядбайнасьці, неахайнасьці і проста шкодніцтва.

Пераважная частка супрацаўнікоў Менакрфа слаба кваліфікаваныя. Толькі 35 проц. усяго штату служачых поўнасьцю апраўдваюць сваё прызначэньне. Рэшта з работай слаба спраўляецца.

Рабочая праслойка ў апараце вельмі незначная. Толькі **10 проц. супрацаўнікоў—былыя рабочыя.** 28 проц. служачых былыя сяляне, з якіх частка і дагэтуль зьвязана з кулацтвам (Белы, Асіеўскі і інш.), **10 проц. сярод служачых—сацыяльна-варожы, антысавецкі элемэнт.**

ЯЧЭЙКА І МЯСЦКОМ У РОЛІ ПАСЫЎНЫХ ГЛЯДАЧОЎ

Да апошняга часу ніякіх мер для арабочаньня апарату Менакрфа ня прымалася. Яшчэ больш: справа ацэньваньня апарату натыкалася заўсёды на ўпартыя перашкоды з боку адказных супрацаўнікоў Менакрфа. Курсанты, якія прысылаліся на практыку з фінкурсаў, не скарыстоўваліся на спэцыяльнасьці. Іх нагружалі рознай перапіскай і дробязнымі апэрацыямі. Некаторыя з курсантаў прымушаны былі шукаць практыкі ў іншых установах. **Ячэйка КП(б)Б і мясцком** Менакрфа мала цікавіліся вывучэньнем работы апарату, не рэагавалі на хваравітыя зьявішчы ва ўстанове.

Ячэйка не ўсьвядоміла дырэктыў партыі аб ролі савецкіх ячэек у справе нагляду за работай установы. Гэта факт.

С. Г—н.

Бліжэй да рабочых мас

Савецкія ўстановы павінны рабіць справаздачы перад рабочымі на фабрыках і заводах

Аб сувязі органаў улады з рабочай масай у апошні час гавораць вельмі многа. І ня дзіва. Бо бюракратызм і цяганіна разьвіваюцца ў нашых савецкіх установах іменна дзякуючы адсутнасьці гэтай сувязі. Мы самі не заўважваем у сябе тых дэфэктаў, якія маглі-б паказаць нам рабочыя, калі-б мы перад імі пэрыядычна рабілі справаздачы. Такі мэтад пэрыядычнай справаздачнасьці перад рабочай масай асабліва прынёс-бы карысьць нашым судовым установам, папершае таму, што яны больш за ўсё ў сваёй рабоце зьвязаны з рабочай масай, а падругое, што іменна судовы апарат, па сваёй прыродзе, больш чым іншы зьяўляецца бюракратычным.

Што-ж мы ў гэтых адносінах зрабілі да гэтага часу і як мы павінны паставіць гэтую работу ў далейшым? Трэба адкрыта заявіць, што як у галіне папулярызацыі права сярод працоўных, так і ў адносінах справаздачнасьці перад рабочымі аб сваёй дзейнасьці, намі ў г. Менску да гэтага часу нічога ня зроблена. Нават з нарасядацелямі, з якіх нарэшце, мы павінны выхоўваць судовых работнікаў, мы амаль жаднай работы не праводзім.

У далейшым гэтую работу трэба паставіць так: усю работу па папулярызацыі права і справаздачнасьці перад рабочымі масамі г. Менску трэба сканцэнтраваць пры акруговым судзе, які павінен распрацаваць агульны плян правядзеньня гэтай работы, узгадніўшы яго з ЦСПСБ. Паводле гэтага пляну ўсе судовыя органы гор. Менску павінны ў пэўны час, але ў розныя дні, рабіць справаздачы па сходах рабочых заводаў і фабрык, прычым на гэтых сходах павінны зразумела прысутнічаць усе без выключэньня работнікі юстыцыі, у тым ліку члены калегіі абаронцаў. Увесь сабраны ў спрэчках па дакладах матар'ял, па сканчэньні ўсёй справаздачнай кампаніі, павінен падагульвацца на спэцыяльным сходзе работнікаў юстыцыі з удзелам нарасядацеляй і членаў адміністрацыйна-прававой сэкцыі гарсавету. Павінен быць зроблены агульны даклад аб стане работы судовых органаў у гор. Менску з улікам таго, што адзначалася на рабочых сходах. На падставе ўсяго гэтага павінны распрацоўвацца канкрэтныя мэрапрыемствы па зьнішчэньні недахватаў у рабоце судовых органаў. Пасьля пэўнага часу, зноў такі ў плянавым парадку, судовыя органы павінны па рабочых сходах інфармаваць аб ступені выкананьня прынятых імі прапаноў.

Такім чынам, пам здаецца, лёгка будзе зьнішчыць усе тыя непарманасьці, што да гэтага часу маюць яшчэ месца ў нашых судовых органах. Зразумела, што гэтая работа, як і ўся іншая работа, павінна праводзіцца пад агульным кіраўніцтвам ячэйкі КП(б)Б пры НКЮ.

Сувязь з масай у сваёй штодзённай рабоце зьяўляецца лепшай гарантыяй выкараненьня бюракратызму і цяганіны з савецкага апарату.

Нарсудзьдзя яўр. нацкамэры **Сідранскі.**

Сакратар нарсуду 1-га вучастку **Шрайбман.**

Ад рэдакцыі: Прапанова т. т. Сідранскага і Шрайбмана ня новая. Гэты мэтад справаздачы перад рабочымі масамі з посьпехам практыкуецца ў вялікіх цэнтрах Саюзу, як Масква, Ленінград, Іванава - Вазьнясенск. У нас, у Менску, ён яшчэ не набыў права грамадзянства, ня гледзячы на яго сваячасовасьць, асабліва цяпер, калі мы праводзім чыстку апарату, імкнемся выявіць усе дэфэкты ў сыстэме нашага кіраўніцтва. Ясна, што сувязь з рабочымі масамі ня толькі палегчыць гэтую задачу, але і значна ўзьніме аўтарытэт нашых устаноў. Таму мэтад справаздачнасьці перад рабочымі на фабрыках павінны практыкаваць ня толькі судовыя органы, але і рэшта нашых устаноў, уключаючы і наркаматы.

Вясковая беднота актыўна дапамагае палепшыць апарат

Папярэднія вынікі чысткі ў Парыцкім раёне (Бабруйшчына)

Да чысткі апарату раёны Бабруйшчыны падрыхтаваліся кожны пасвойму. Калі ў Глуску падрыхтоўка праведзена здавальняюча, калі поруч з ім ідзе Асіпавіцкі раён, дык Стара-Дорскі спазьніўся. Слуцкі правёў здавальняючую падрыхтоўку толькі ў самым горадзе.

Больш падрабязна трэба спыніцца на Парыцкім раёне—першым, у якім чыстка ўжо праводзіцца і мае некаторыя вынікі.

У Парыцкім раёне падрыхтоўчая праца праведзена сваечасова, праведзены рад сходаў у мястэчку і ў вёсках, брыгады в рабочых і сялян правялі агляд працы ўстаноў. На асобных нарадах брыгад абгаварвалася іх праца быў распрацаваны плян чысткі. А 20 чэрвеня пачалася і чыстка.

Першымі былі праверены парсуд і міліцыя. На сходах па чысткі гэтых устаноў прысутнічала шмат местачкоўцаў і сялян вакольных вёсак. Удзельнікі сходаў правялі вялікую актыўнасьць.

Выяўлена, што ў судзе меліся выпадкі скрыўленьня клясавай лініі за аднолькавыя справы і кулак, і бядняк атрымлівалі аднолькавую кару. Сакратар нарсуду **Якубовіч** груба адносіўся да наведвальнікаў.

У міліцыі быў такі факт: справавод **Мішур** па афіцыйнай адносіне атрымоўваў у сьвяточныя дні гарэлку з крамы спажывецкага таварыства, адносіну падпісваў сам намесьнік начальніка міліцыі. Часта бывае, што ў міліцыі нікога ня знойдзеш.

У ліку беспрацоўных лічылася дачка гандляра Элькінда. Член саюзу Сяверына ў саюзе знаходзіца 8 гадоў і 8 месяцаў, а працавала... 2-3 месяцы: ёй праца непатрэбна, яна на працягу некалькіх год атрымлівала дапамогу ад страхкасы і ад цэнтральнага паштовага кіраўніцтва.

На пошце выяўлены рад злоўжываньняў: грошы за падпіску не здаваліся падпісчыкі газэт не атрымоўвалі. Ёсьць моманты п'янства, антысэмітызму, скіск, адсутнічае лесарубачная біблятэка, складалі характарыстыкі на асобных працаўнікоў, накіроўвалі на мэдыцынскі агляд для выяўленьня працаздольнасьці. Некаторыя кіраўнікі ўстаноў «правяралі» адзін аднаго, зразумела, выхвалялі сябе.

Камісія праверыла ўжо 14 устаноў з 130 працаўнікамі, зьнята з працы 6; былы загадчык пошты **Карпенка**—палякалісты, бюракрат, пасьля ўходу палякаў у яго знойдзена захаваная зброя, кулаком пасылкі прыносіў да хаты, а пасылкі рабочых трымаў па два месяцы, **Тульман**—бухгальтар сампрамкаапцрацы, часта замяшчаў старшыню, а ў той час ён кантар сынагогі, **Арлоў**—грошы па падпісцы на газэты браў сабе, п'яніца, **Якубовіч**—сакратар суду, за бюракратызм, **Шчэрбін**—ляслынік, за злоўжываньні, загадчык крамы спажыв. таварыства за растрату. Некаторыя працаўнікі атрымалі спагнаньні.

Вось папярэднія вынікі чысткі ў Парыцкім раёне.

Ш.

Высьветлены ў працэсе працы і недахопы: кіраўнікі ўстаноў чакалі чысткі, а падрыхтоўкі ніякай не зрабілі.

У Шацілках парт'ячэйка вышуквала бюракратаў на Урале, у Маскве, у Харкаве, на чыгунцы, а аб сваіх установах менш за ўсё дбала.

Значная частка агляду ўстаноў брыгадамі не дала ўсё-ж вынікаў. Агляд быў зьведзены да простага рэвізійнага агляду; так, правяралі правільнасьць спагнаньня грошай на лесарубачных білетах, складалі характарыстыкі на асобных працаўнікоў, накіроўвалі на мэдыцынскі агляд для выяўленьня працаздольнасьці. Некаторыя кіраўнікі ўстаноў «правяралі» адзін аднаго, зразумела, выхвалялі сябе.

Камісія праверыла ўжо 14 устаноў з 130 працаўнікамі, зьнята з працы 6; былы загадчык пошты **Карпенка**—палякалісты, бюракрат, пасьля ўходу палякаў у яго знойдзена захаваная зброя, кулаком пасылкі прыносіў да хаты, а пасылкі рабочых трымаў па два месяцы, **Тульман**—бухгальтар сампрамкаапцрацы, часта замяшчаў старшыню, а ў той час ён кантар сынагогі, **Арлоў**—грошы па падпісцы на газэты браў сабе, п'яніца, **Якубовіч**—сакратар суду, за бюракратызм, **Шчэрбін**—ляслынік, за злоўжываньні, загадчык крамы спажыв. таварыства за растрату. Некаторыя працаўнікі атрымалі спагнаньні.

Вось папярэднія вынікі чысткі ў Парыцкім раёне.

Ш.

„ВОСЕМ МЕСЯЦАЎ ПЛЯНУЕМ, А РЭШТУ ПРАЦУЕМ"

Чыстка апарату мазырскіх зямельных органаў

У Мазыры пачалася чыстка апарату зямельных і лясных органаў...

Праведзенае абсьледваньне спэцыяльнай камісіяй работы Акраз і інспэктарыяты лясоў выявіла рад моментаў, якія павінны быць улічаны пры чысткі.

Кідаецца ў вочы, папершае, тое, што работнікі ўстаноў аднесьліся да абсьледваньня, як да «рэвізіі начальства», фармальна даюць адказы, імкнуцца абараніць адзін другога.

Другое і асабліва хворае зьявішча—«папяровае мора». Здаецца, няма ў акрузе такой другой установы, у якой-бы пісавалі столькі паперы, сколькі не псуюць у Акрза. Калі не знаходзяць ужо чаго перапісваць, дык перадрукоўваюць інструкцыі з бюлетэняў СНК і пасылаюць іх у раёны, ня гледзячы на тое, што бюлетэні атрымліваюцца і на мясцох.

Ня дзіва таксама і тое, што гэтая «пісаніна» не дае магчымасьці работнікам выяжджаць на раёны для жывога кіраўніцтва і інструктаваньня. Так, напрыклад, інструктар-палявод з кастрычніка месяца па ліпень месяц толькі адзін раз выяжджаў у раён і то ў Калінкавічы. Сам загадчык акраз т. Вайпаховіч заявіў на сходзе: «Мы 8 месяцаў плянуем, а рэшту працуем».

Характэрна між іншым адзначыць, што пасьля праведзенай у мінулым годзе рацыяналізацыі справаздачнасьць павялічылася ў два разы. Супрацаўнікі не праяўляюць ніякай ініцыятывы да спрашчэньня работы, да рацыяналізацыі працы. За ўвесь час у эканомкамісію паступіла чатыры прапановы ад двух супрацаўнікоў па пытаньнях працы. Ня дзіва, што ва ўстанове пануе цяганіна: 8-га красавіка была атрымана заметка з рэдакцыі газэты, па якой трэба было правесьці расьсьледваньне. Заметка праляжала тры месяцы ў партфэлі і зараз яшчэ ня даны адказ рэдакцыі. Другі характэрны выпадак: кожны супрацаўнік бярэ з сабою справы, а калі тэрмінова была патрэбна ўклікаць гэтага работніка з раёну. Адно з самых хворых зьявішч гэта безадказнасьць за працу спэцыялістых: па кожнай дробязі ідуць да загадчыка ўстановы за санкцыяй.

Усё гэта трэба ўлічыць пры чысткі гэтых апаратаў, каб узварушыць работнікаў, каб ударыць па казёншчыне і безадказнасьці.

* * *

Агульны сход, прысьвечаны чысткі акраза, адкрыўся пры перапоўненай залі. Прысутнічаюць чырвонаармейцы і служачыя. Пачынаецца праверка.

Вось як характарызуе сход працу спэцыялістага культурэхніка **Кірухіна.** Кірухін сваю працу праводзіць бяз пляну. Вазіў насеньне з аднаго раёну ў другі, пакуль сяляне ня скончылі сяўбы. Такім чынам, Кірухін сарваў вясеньнюю пасёўкампанію. За апошні год ён патраціў 1.058 руб. на камандыроўкі, а працы ніякай не зрабіў; замест таго, каб паехаць на вёску, ён езьдзіў у Гомель. Кірухін—гультай, бюракрат. У Земаддзеле ён гаворыць, што ідзе працаваць у саюз, а ў саюзе, што—ў земаддзел, а ўрэшце ні тут, ні там не працуе, ходзіць у горадзе п яны. Сяляне ніяк ня могуць знайсьці Кірухіна.

А вось і другі спэцыялісты—**Очкін Васіль** былы памешчык, які да рэвалюцыі меў 800 дзесяцін зямлі, ён-жа былы афіцэр. Высьвятлілася, што ён зусім ня спец, а толькі скончыў 6-цімесячныя курсы па пчалярстве. На запытаньне камісіі, што ён зрабіў карыснага для сацыялістычнай перабудовы вёскі за час сваёй працы на пасадзе акруговага інструктара па пчалярстве, Очкін адказвае, што арганізаваў чатыры арцелі пчаляроў. Але-ж пры далейшым допыце высьвятлілася, што ўсе чатыры арцелі арганізавалі райграномы, а Очкін толькі прысутнічаў на сходзе пры арганізацыі аднэй арцелі.

Очкін быў камандыраваны ў Каралінскі, Нараўлянскі і Азарыцкі раёны для правядзеньня вясеньняй пасёўкампаніі,—«барын» прыехаў, склаў акт аб тым, што ачыстка насеньня не праводзіцца, і паехаў далей, а насеньне так і засталося неачышчаным. Вынікі зусім зразумелыя: былому памешчыку ня вельмі цікава праводзіць перабудову вёскі.

А вось трэці спэц-інструктар па лесазагу—**Малеў,** былы гандляр, лесапрамысловца, працу сваю добра ведае, але што з гэтага, калі ён нікому сваіх ведаў не перадае, ня толькі ня хоча вучыць другіх, але ўсякім спосабам стараецца зьняць з пасады рабочых і служачых, якія сумленна працуюць, і на іх месца пасадзіць сваіх людзей.

У Гомелі яго зьнялі з працы за пратэкцыянізм, ў Мазыры ён пакуль што пасьпеў толькі 2-х гандляроў Бухмана і Гурвіча прымайстраваць на працу ў лясьніцтвах.

А вось і чацьверты спэц—акрмэліяратар Некрашэвіч, паходзіць з сям'і былых кулакоў. Некрашэвіч, як быццам сваю працу добра ведае, грамадзкай працай ён зусім ня цікавіцца. Камісія, пакапаўшыся ў архівах земаддзелу, знайшла, што ў вёсцы Паніца, Калінкавіцкага раёну была арганізавана мэліяратыўная арцель. Па правядзеньне мэліяратыўных работ даяржава адпусьціла 1.500 руб. доўгатэрміновага крэдыту. Некрашэвіч павінен быў кіраваць працай таварыства, але зусім забыў, што гэта яго справа. Праўленьне арцелі, тымчасам не дачакаўшыся Некрашэвіча, якога некалькі раз запрашала да сябе, раздало даяржаўныя грошы сялянам на «горкую» і таксама супакоілася. Некрашэвіч, які даведаўшыся аб тым, што крэдыт раздалі сялянам, і што мэліяратыўныя работы не праводзяцца, парашыў лепш зусім забыць гэтае т-ва, бо заварушыўшы гэтую справу, можна і самому мець няпрыемнасьці. Таксама забыў Некрашэвіч і тое, што трэба зьняць з працы кулака Грудніцкага і назначыць бедняка, згодна пастановы РСІ. Такім чынам, Некрашэвіч ня толькі ня цікавіўся грамадзкай працай, але ня цікавіўся сацыялістычнай перабудовай вёскі.

Здаецца, што ў гэтай установе знойдзецца каго пачысьціць.

Б. П.

Вызваліліся ад чужых элемэнтаў

(Пухавіцкі раён, Меншчына)

Чыстка савецкага, каапэрацыйнага і гандлёвага апаратаў у нас у раёне пачалася 2-га ліпеня. Праверана на раёне за гэты час ужо каля 100 чал. Добра праведзеная падрыхтоўка да чысткі ў раёне дала належны эфэкт і ў часе праверкі. Сотні батракоў, беднаты і серадняцтва прынялі самы шчыры ўдзел у праверачных сходах і дапамаглі праверачнай камісіі выявіць усіх тых працаўнікоў, якія нядбайна адносіліся да працы, рабілі розныя злачынствы, стваралі бюракратызм і цяганіну, чым перашкаджалі нашаму будаўніцтву. Праверка паказала, якое палітычнае значэньне мае чыстка савецкага апарату, выявіла твар кожнага працаўніка і яго адносіны да насельніцтва і значна аздаравіла наш апарат, выявіўшы яго ад чужых элемэнтаў.

Зьнята з працы 6 чал., якім на працягу 2 гадоў забаронена займаць адказныя пасады, аднаму забаронена зусім працаваць ва ўстанове, 5 чал. атрымалі суровую вымову, 9 чал. пастаўлена на від.

Селькор Дрозд.

ПАДРЫХТОЎКА ДА СЯЎБЫ НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ

Акрэа абмяжоўваецца абяцанкамі.—Аграномы і кіраўнікі ў адпачынку. Патрэбны тэрміновыя меры

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). У большасьці раёнаў акругі падрыхтоўка да асеньняй сяўбы знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Пляны асеньняй сяўбы на шырокіх сялянскіх сходах не абгаварваюцца. У Церахаўскім раёне плян асеньняй сяўбы не разасланы з-за браку машыністкі. У некаторых раёнах аграномы і асноўныя кіраўнікі разьехаліся ў водпуск.

Акрзямаддзел сваё кіраўніцтва ажыцьцяўляе пасылкай цыркуляраў. На Дабрускай фабрыцы ў працягу некалькіх месяцаў ляжала каля 20 тысяч пудоў перамолатай вапны. бо саўгасы адмовіліся скарыстаць гэтыя адкіды для ўгнаеньня глебы.

Толькі і жніўня ўпаўнаважаны Белсельтрэсту паслаў распараджэньне саўгасам аб падрыхтоўцы да вапнаваньня.

Палессельсаюз у працягу двух месяцаў не выкупляў абсталяваньня для млыну па перамоле вапны.

Трэба прыняць тэрміновыя меры да зьнішчэньня гэтых агідных зьявішч. Аграпэрсанал павінен выканаць пункты абавязацельстваў па сацыялістычным спаборніцтве.

Бяз удзелу працоўных мас

На 15-е ліпеня па Полацку скончылася чыстка акрдзяржстраху, сельбанку, дзяржбанку, акрсуду і пракуратуры.

Чыстка невыстарчальна закрапула самую сыстэму ў працы гэтых устаноў за выключэньнем аддзяленьня дзяржбанку, работа якога рэзка крытыкавалася.

У дзяржбанку, калі выкрылі злоўжываньні былога бухгалтара, высьвятлілася яшчэ многа розных недарэчнасьцяў і недахопаў у апараце. Дзякуючы няўмеламу кіраўніцтву, несваечасоваму рэагаваньню на паасобныя факты, расла магчымасьць усё большага разлажэньня апарату. Пры чыстцы выявілася бескантрольнае і бяссыстэмнае выдаткаваньне сродкаў на розныя выдаткі, няправільнасьць у разьмеркаваньні працы сярод працаўнікоў і інш. Гэта было ўскрыта дзякуючы таму, што тройка садзейнічаньня, а таксама камісія заглянула «за кулісы» і ў сталы працаўнікоў.

У астатніх-жа ўстановах так праверыць усю іх працу не ўдалося, бо самы падыход да агляду работы троек садзейнічаньня насіў падта афіцыйны характар.

Трэба сказаць, што задачы чысткі па выкрываньні недахопаў работы апарату незалежна ад таго, ці вінаваты, ці не ў гэтым работнік,—усё-ж дагэтуль не ўсьвядомлены. Уся работа аддае афіцыяльшчынай,—ва ўсім праглядвае боязнь за сваю шкуру. Шмат часу аддавалася непатрэбным дробязям. Выступленьні на сходах мелі надзвычайна вузкі характар, звычайна выступалі 3-5 чалавек, якія падтрымлівалі «актыўнасьць».

З яўкаю на сходы таксама справа абстаяла ня зусім добра. Максымальна на сходах прысутнічала 70-80 чалавек, пры зусім слабым удзеле рабочых з прадпрыемстваў.

Прафорганы не з выстарчальнай увагай аднесьліся да падрыхтоўчай работы на чыстцы. Нават рад савецкіх органаў нядбайна аднёсься да работы камісіі, асобным камісіям прыходзілася па два разы ў дзень пераносіць пасяджэньні.

ЛЮДЗІІ ІХ РАБОТА

Яшчэ камісія па чыстцы апарату ня прыехала на тэрыторыю раёну, а так званы «чысьцільны настрой» ужо створаны. Камісію чакаюць парознаму. Адны чакаюць яе, каб выказаць ёй усё набалеўшае, усе непаразуменьні і няправільнасьці (хоць часамі можа і дробныя), каб «разьвязаць перад прадстаўнікамі языкі», бо: «камісія, яна разьбярэцца, яна рассудзіць, хто вінаваты, а хто не».

Такія размовы вельмі часта ўжо можна пачуць ад працоўнага насельніцтва. Матар'ял да чысткі пакуль што паступае яшчэ даволі слаба, гэта часткова тлумачыцца і тым, што многія чакаюць камісіі, чакаюць папыраных сходаў і там ужо...

Патрэбна толькі будзе паклапаціцца, каб гэтыя сходы былі сапраўды **масавымі працоўнымі сходамі,** каб **працоўнае насельніцтва** мястэчку і раёну **пагалоўна прысутнічала на сходах.** Гэта самае галоўнае. Другая група чакае камісію ня зусім з радасьцю. Нэрвова перагортваючы лісткі календара, лічаць яны дні, колькі засталося да прыезду камісіі, выкарыстоўваюць гэтыя дні, каб найлепш афарбавацца ў чырвоны колер. Як гэта ўдасца некаторым, будзе відаць крыху пасьля... А пакуль... Ва ўсе бакі СССР пішуць «сьпешныя лісты, каб сабраць факты свайго «рэвалюцыйнага мінулага», сабраць даведкі для залічэньня сябе ў графу — «рабоча-сялянская» паходжаньня.

Гэта група ў апошні час самая прыкладная: на заняткі прыходзіць раней на паўгадзіны, з наведвальнікамі абыходжаньне самае найлепшае, працоўныя вельмі зьдзіўлены такою рэзкаю пераменаю мясцовых Іванаў Іванавічаў і Акакіяў Акакіявічаў.

Трэцяя група зусім адрозьніваецца ад гэтых. Звычайна людзі гэтае групы, маючы пад сабою цьвёрды грунт «рабоча-сялянская паходжаньня», зусім не зьвяртаюць увагі як на сваю працу ва ўстанове, так і на надыходзячую чыстку. Гэтыя людзі лічаць, што чыстка здарылася па непаразуменьні, а калі ўжо здарылася, дык толькі для былых людзей.

— «Што мне чыстка, або працоўная дысцыпліна? У мяне пахаджэньне рабоча-сялянскае, дык у чым-жа справа? вычысьцяць? няхай паспрабуюць??» — Такія словы можна пачуць з вуснаў таварышоў гэтае групы. На заняткі гэтая група позьніцца з наведвальнікамі абыходзіцца ня зусім добра, сваё абавязкі выконвае «пастолькі паскольки» і наогул вядзе працу пад лёзунгам: «плюй на ўсё, ды беражы здароўе».

Бязумоўна, мы ня думаем усіх сумленных, адданых сав. уладзе служачых падводзіць пад якую-б то ня было з гэтых катэгорый, яны зьяўляюцца залатым асяродкам установы, але-ж як кажуць «у сям'і не бяз вырадка».

Юр. БЯЛЬКО.

М-ка Старобіна, Бабруйшчына.

АБ ЗАБЫТЫМ ЗЬВЯНЕ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАЎНІЦТВА

**«Выкананьне задач, што стаяць перад савецкай уладай у галіне правядзеньня паказанага тэмпу індустрыялізацыі і сацыялістычнае перабудовы сельскае гаспадаркі, патрабуе сыстэматычнае рэарганізацыі ўсяго апарату даяржаўнага кіра

НАСТАЎНІК—АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛЬНІК ЗЬЛЁТУ

Піянэрскі зьлёт павінен быць самай блізкай справай настаўніцтва.

Настаўніцтва павінна прыняць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзеньні піянэрскага зьлёту.

Піянэрскі зьлёт павінен пакласьці пачатак яшчэ большаму прыцягненьню савецкага настаўніцтва да работы ў піянэрскай арганізацыі*). Здавалася, што ўсе гэтыя задачы бясспрэчны, ясны. Аднак, прайшоўшыя райзьлёты ў большасьці выпадкаў паказалі зусім другі малюнак,—настаўніцтва прымала слабы ўдзел у зьлётах.

Гэты сур'ёзны недахоп павінен быць выпраўлены шляхам шырокага прыцягненьня настаўнікаў, і выхавальнікаў да ўдзелу ў **усебеларускім** зьлёце піянэраў.

Да 10-га жніўня ўпяршыню ў Менск зьлятаюцца больш 500 піянэраў з розных куткоў Беларусі. Дэлегаты ўсебеларускага зьлёту будуць разьмешчаны па кватэрах рабочых, там, дзе ёсьць піянэры. Выканаць гэта магчыма таму, што рабочыя Менску горача адгукнуліся на заклік узяць на сябе маленькіх дэлегатаў.

Настаўнікі, выхавальнікі павінны ўзяць прыклад з рабочых і ўдзяліць увагу ўсебеларускаму зьлёту ў справе яго пэдагогічнага абслугоўваньня.

Чаго-ж мы жадаем?

Рабочыя, на кватэрах якіх будуць разьмеркаваны дэлегаты ўсебеларускага зьлёту, яшчэ дастаткова незнаёмы з правільным пэдагогічным падыходам да дзяцей. Патрабуецца прымацаваньне аднаго—двух настаўнікоў да вызначаных кватэр рабочых на працягу 5 дзён—для пэдагогічнага нагляду за тым, як жывуць дэлегаты, для правядзеньня гутарак аб ролі і задачах піянэрскай арганізацыі.

Нельга ня спыніцца на важнейшым сродку пэдагогічнай прапаганды сярод рабочых-бацькоў. Справа ідзе пра часопіс «О наших детях», якая выдаецца пад рэдакцыяй **Н. К. Крупской**. Ці-ж многа рабочых сем'яў ведае аб гэтай часопісі? Амаль ніхто. А між тым часопіс выдаецца для бацькоў і вельмі добра адказвае на пытаньне, як знаёміць дзяцей з акаляючым жыцьцём. Наогул часопіс «О наших детях» дае каштоўныя парады, як праводзіць камуністычнае выхаваньне дзяцей. Вось чаму пашырэньне часопісі ў масы зьяўляецца аднэй з форм шырокай прапаганды правільнага патрэбнага нам выхаваньня. Настаўнік, выхавальнік, вядучы гутарку з бацькамі ў часе зьлёту, можа зрабіць усё патрэбнае, каб гэтая часопісь стала ўласнасьцю бацькоў, каб гэтым садзейнічаць павышэньню пэдагогічнага ўзроўню рабочага.

Ясна бяз лішніх слоў, што піянэрскі зьлёт прадстаўляе сабой выключны выпадак для разгортваньня шырокай пэдагогічнай прапаганды сярод рабочых. Тут патрэбны дзесяткі добраахвотнікаў—настаўнікаў, выхавальнікаў для выкананьня гэтай важнай работы.

11-га жніўня адкрываецца першая ўсебеларуская выстаўка работы піянэраў і дзяцей, яе наведае многа дзяцей, бацькоў.

Тут месца і настаўнікам.

На зьлёце будуць працаваць сэкцыі па асобных канкрэтных пытаньнях нашай працы: аб паходзе за ўраджай і аб удзеле ў ім піянэрскай арганізацыі і дзяцей, абахове эканамічных інтарэсаў дзяцей батракоў, падпаскаў, няняк і дзяцей, якія працуюць на найме. Тут таксама ўдзел настаўнікоў вельмі патрэбен.

На вечары самадзейнасьці, на фізкультурных спаборніцтвах, экскурсіях, у вольныя гадзіны на зьлёце для любымых заняткаў піянэраў і дзяцей (гульні, сьпевы, масавыя выступленьні) у сталоўцы—усюды патрэбен удзел настаўніка. Зьлёт, яго вымест зьяўляецца каштоўным матар'ялам для дасьледчай работы настаўніка. Тыя настаўнікі, выхавальнікі, якія жадаюць працаваць рука аб руку з піянэрарганізацыяй, не пашкадуюць сіл для такой важнай работы. Настаўнікі, выхавальнікі, якія жадаюць узяць на сябе абавязкі па пэдагогічным абслугоўваньні зьлёту, павінны зараз-жа заявіць аб гэтым у цэнтральны штаб зьлёту пры ЦК Камсамолу і ў Цэнтральнае праўленьне саюзу працасьветы.

Да пачатку зьлёту засталося некалькі дзён. Настаўнікі і выхавальнікі! бяз усякіх затрымак возьмемся за практычную працу!

Л. Рыін.в

*) Трэба-ж проста сказаць, што сувязь піянэрарганізацыі з настаўніцтвам далёка яшчэ невыстарчальная.

Закладка дрэваапрацоўчага камбінату

У Нова-Беліцы дзень індустрыялізацыі адзначаны закладкай асноўнага корпусу дрэваапрацоўчага камбінату Лесбелу. Камбінату адведзены пляц у 15 гакт. зямлі.

Пабудова і абсталяваньне камбінату, паводле папярэдняга каштарысу, будзе каштаваць 5 млн. руб.

250 тысяч бядняцкіх гаспадарак атрымаюць ільготы па страхаваньні

Сёлета ў Беларусі было вызвалена ад абавязковага акладнога дзяржаўнага страхаваньня 226.000 гаспадарак беднякоў сем'яў чырвонаармейцаў, чырвоных партызан і інвалідаў на суму 708.000 р.

У 1929-30 г. лік ільгот павялічваецца. Будзе вызвалена ад акладнога страхаваньня 250.000 бядняцкіх гаспадарак на суму каля мільёну 170.000 р., што складае 15 проц. ад агульнай налічанай сумы па акладным страхаваньні. Ільготы разьмеркаваны па ўсіх акругах Беларусі: Менскай акрузе прадаставлена ільгот на 201.000 р., Магілеўскай—206.000 р., Гомельскай — 137.000 руб. і г. д.

Ня выкананы плян падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых

Плян падрыхтоўкі курсамі ЦІП кваліфікаваных рабочых будаўнікоў сёлета ня выкананы. Меркавалася выпусьціць 1072 будаўнікоў розных спэцыяльнасьцяй. Фактычна-ж скончыла курсы 594 ч. Невыкананьне пляну выклікана тым, што падрыхтоўка гэтых кадраў пачалася са спазьненьнем. Апрача таго жадаючых вучыцца на курсах было мала з прычыны матар'яльнай незабясьпечанасьці слухачоў.

У новым гаспадарчым годзе мяркуецца выпусьціць 1370 кваліфікаваных рабочых будаўнікоў. Пры чым будзе ўзяты курс на паляпшэньне выпуску ліку каменшчыкаў і павялічэньне выпуску тынкароў.

У МЕНСКУ АДКРЫВАЮЦЦА НОВЫЯ ЦЭХІ: СЬЛЕСАРНА-ВАДАПРАВОДНЫ—НА 60 ЧАЛАВЕК І БЛЯШАНЫ—НА 40 ЧАЛАВЕК. Адкрываецца таксама аддзяленьне цесьляроў. Базы курсаў ЦІП будуць існаваць у Менску, Віцебску і Гомелі.

Работу кас ашчаднасьці —пад кантроль мас

Галоўная каса ашчаднасьці пачала праводзіць сходы рабочых, на якіх даюцца справаздачы аб рабоце кас.

5 жніўня быў праведзены аб'яднаны сход рабочых заводаў «Бальшавік» і «Энэргія», а 6-га жніўня — на заводзе «Камунар». З дакладамі выступаў загадчык галоўнай касы тав. Падольскі.

Даклады выклікалі вялікую актыўнасьць рабочых, якія ў сваіх прамовах адзначалі рад недахопаў у працы кас ашчаднасьці.

Рабочаму прыходзіцца доўга чакаць, пакуль каса правядзе тую ці іншую аперацыю. Працаўнікі кас часта ня маюць адпаведнай кваліфікацыі.

Рабочыя лічаць патрэбным больш шырока папулярызаваць працу кас ашчаднасьці сярод жонак рабочых і на прадпрыемствах.

Трэба пашырыць сетку кас ашчаднасьці на прадпрыемствах. Касы ашчаднасьці павінны ісьці на сустрач запатрабаваньням рабочых. Маюцца выпадкі, калі касы адчынены толькі ў час, калі рабочыя заняты на працы.

Вялікая навальніца ў Магілеўскай і Аршанскай акругах

У многіх вёсках пабіты пасевы

У Менску атрымана паведамленьне аб вялікім градабіцьці ў Клімавіцкім раёне, Магілеўскай акругі і Круглянскім, Дубровенскім і Копыскім раёнах, Аршанскай акругі. Страты дасягаюць некалькі дзесяткаў тысяч рублёў. У адным толькі Дубровенскім раёне градам выбіты поўнасьцю пасевы азіміны і яравых 20 вёсак. У раёны выехаў інспэктар-аграном Белдзяржстраху для выяўленьня страт і аказаньня дапамогі пацярпеўшаму насельніцтву.

Да ведама рабселькораў

За апошні час рэд. газ. «Зьвязда» атрымала шмат лістоў, у якіх рабселькоры высоўваюць вельмі важныя пытаньні аб далейшым разьвіцьці рабселькораўскага руху. Скардзяцца на тое, што ніякай працы сярод рабселькораў рэд. «Зьвязды» не вядзе, што адмоўна ўплывае на актыўнасьць рабселькораў.

Выпіску з ліста аднаго менскага рабкора тав. **Міхаленка**, рэдакцыя лічыць патрэбным тут падаць:

«Магутным сродкам самавыхаваньня рабселькораў зьяўляецца тая газэта, у якую рабселькор піша, але гэты сродак у нас адсутнічае. Большасьць рабселькораў зьяўляецца партыйцамі, якія выпісваюць «Правду», а выпісваць «Зьвязду» ім цяжкавата».

Таму аўтар прапануе, каб рэд. «Зьвязды» дасылала бясплатна газэту тым рабселькорам, заметкі якіх (ня менш аднэй) надрукаваны ў «Зьвязьдзе», і калі гэтыя рабкоры на працягу двух месяцаў у газэту пісаць ня будуць, тады спыніць ім дасылку газэты бясплатна.

Вось думка рабкора **Міхаленка.**

Рэдакцыя з свайго боку ня будзе зараз вясьці дыскусіі па гэтым пытаньні і лічыць больш мэтазгодным, каб наконт прапановы рабкора Міхаленка выказалі сваю думку рабселькоры газэты «Зьвязда».

Што датычыць наогул працы з рабселькорамі, масавы аддзел рэдакцыі газ. «Зьвязда» паведамляе, што ўжо распрацаваны канкрэтны плян працы з рабселькорамі на жнівень—сьнежань месяцы, які прадугледжвае ўсе слабыя месцы ў працы з рабселькорамі. Гэтымі днямі плян будзе надрукаваны ў газэце, а таксама будзе абгаварвацца на пашыраных нарадах рабселькораў.

Усе прапановы, якія ўносяць рабселькоры аб палепшаньні працы, будуць улічаны пры зацьверджаньні пляну.

МАСАВЫ АДДЗЕЛ.

400 тыс. руб. на грамадзкія работы ў Менску

Камітэт Біржы працы разглядзеў плян грамадзкіх работ у Менску на 1929-30 г. На грамадзкія работы адпушчаецца каля 400 тыс. руб. На гэтых работах будзе занята штодзенна каля тысячы беспрацоўных. Плянам прадугледжаны і зімовыя грамадзкія работы. У парадку грамадзкіх работ будзе вясьціся пабудова трамваю, каналізацыі, скончана ўпарадкаваньне Антонаўскага парку, пабудова Лагойскага тракту, стадыёну, а таксама пляніроўка Кірсанаўскага шляху да балотнай станцыі і інш.

Посьпех беларускага шкла ў Турцыі

Завод „Домбаль" пераводзіцца на выраб экспартнага шкла

Белшклотрэст значна пашырае сваю экспартную праграму. Плян вывазу шкла заграніцу павялічваецца на 100 процантаў.

Шклофарфаравы камітэт ВСНГ СССР пераводзіць заводы «Домбаль» у Барысаве і «Ноўкі» ў Віцебскай акрузе выключна на выпрацоўку экспартнага шкла. Усяго па СССР пераводзіцца на экспартную работу тры гуты, з якіх дзьве прыходзіцца на Беларусь.

У 1929-30 г. заграніцу будзе экспартавана 13 мільёнаў штук лямпавага шкла на суму каля 700 тысяч рублёў.

Шклофарфаравы камітэт ВСНГ СССР запрапанаваў «Продасілікату» накіраваць асноўную частку заказаў на гуты Беларусі. «Продасілікат» паведаміў Белшклотрэсту, што ён мяркуе заказаць каля 8 мільёнаў штук лямпавага шкла на суму 400 тысяч рублёў.

Шкло будзе экспартавана ў Турцыю, дзе беларуская шкляная прадукцыя карыстаецца вялікім посьпехам і выцясьняе сваёю якасьцю шкло чэха-славацкіх фірм.

У зьвязку з разгортваньнем экспарту беларускага шкла, завод «Домбаль» пераводзіцца на непарыўны рабочы тыдзень. Буйныя работы праводзяцца на заводзе «Ноўкі», дзе пабудавана новая печ.

У працэсіі

Эксплёататару па руках

6 гадоў працаваў Грынгауз у прыватніка Русецкага. З-за сямейных прычын ён прымушаны быў кінуць працу. Гаспадар адмовіўся выплаціць яму месячны водпуск (за 2 гады), выхадную дапамогу і выдаць даведку аб працы. Працэсія прымусіла гр. Русецкага выплаціць Грынгаузу кампэнсацыю за месячны водпуск і выхадную дапамогу.

Аблічылі на 154 руб.

Арцель чорнарабочых, працуючы на пабудове унівэрсытэцкага гарадка, зарабіла 170 руб., з яніх атрымала толькі 16 руб. Працэсія пастанавіла іск арцелі лічыць правільным і спагнаць у карысьць рабочых 154 руб.

Электрыфікацыя цэнтральнай малочнай

Малочная будзе пушчана ў кастрычніку

Работы па пабудове ў Менску цэнтральнай малочнай канчаюцца. У Ленінград прыбылі з Даніі машыны для абсталяваньня малочнай. Гэтымі днямі машыны будуць дастаўлены ў Менск.

Дзяржаўны электратэхнічны трэст заключыў дагавор на электрыфікацыю цэнтральнай малочнай, дзе ўстанаўляецца 25 матораў.

У Менсельпроме нашаму супрацоўніку паведамілі, што малочная будзе пушчана ў кастрычніку. На яе пабудову выдаткавана каля 400.000 р. Завод зьявіцца адным з буйнейшых малочных мэханізаваных прадпрыемстваў у СССР. Малочная будзе перапрацоўваць каля 6-х мільёнаў літраў малака ў год.

Арганізуецца беларускі трэст будаўнічай прамысловасьці

У Менску арганізаваўся Беларускі трэст будаўнічай прамысловасьці, які будзе аб'яднаць каля 30 цагельн., кафэльн. вапнян. і бэтонных заводаў, якія раней былі падпарадкаваны Белдзяржбуду. Гэтаму-ж трэсту даручана далейшае будаўніцтва цагельных заводаў. Найбольш значнай работай на бліжэйшы час зьяўляецца пабудова ў Крычаве цэмэнтнага заводу. Эскізны праект заводу ўжо зацьверджаны і з пачатку вясны 1930 г. будзе прыступлена да яго пабудовы.

Што новага ў эфіры

Праграма перадач Менскай радыё-станцыі

Пятніца, 9-га жніўня

17-30—18-00 Час акцябрат.
18-00—18-25 Выступленьне старшыні гарсавету аб дабрабыце гораду.
18-25—18-50 Даклад аб чыстцы радоў партыі.
18-50—19-10 Музычны адпачынак.
19-10—19-30 Аб каапэрацыі.
19-30—20-20 Беларуская радыёгазэта.
20-20—20-40 Выступленьне старшыні ЦП саюзу рабземлесу т. Войтэнкава.
21-00—23-30 Канцэрт—у перапынках агляд заўтрашняй прэсы.

Тэатр і кіно

Гастролі музычнае камэдыі

Нявіданая адсталасьць тэатральнай тэхнікі, адсутнасьць кваліфікацыі актораў, прымітыўнасьць балету—вось асноўныя асаблівасьці той апэрэты, якая працуе ў Менску.

Як ні кепскае афармленьне. яно нішто ў параўнаньні з тым зьместам, які падносіцца апэрэтай зараз, калі ўжо 11 год існуе цэлы рад рэвалюцыйных тэатраў з ідэалёгічна патрэбным рэпэртуарам.

Князь, граф ці прынц—вось галоўны гэрой так званае «клясычнае» апэрэты. Інтрыга вельмі нескладаная і як дзьве кропкі вады напамінае адна другую. Князь, граф ці прынц кахае «бедную» і простую дзяўчыну, якая ў канцы канцоў аказваецца таксама княгіняй. графіняй ці прынцэсай. Новая, так званая «дэмакратычная» апэрэта замяніла прынца багацеям, які імкнецца жаніцца на беднай красуні. Але гэта красуня ня гоніцца за багацьцем; яна кахае беднага. але шляхетнага маладога хлапца. Разьвязка апэрэты заўсёды шчасьлівая і абавязкова канчаецца вясельлем.

Вось на якім зьмесьце прыходзіцца вучыцца глядачу, цаніць мастацтва. Трэба наогул падкрэсьліць, што апэрэта самы адсталы від тэатральнага мастацтва ў СССР. Кожная апэрэта ня толькі пляцецца ў хвасьце іншых драматычных форм, але нават ня бачыць гэтага хваста з-за таго кафэшантаннага чаду, якім яшчэ да гэтага часу прасякнута яе афармленьне.

Між тым у нас за апошнія гады зьявіўся рад новых больш менш здавальняючых музычных камэдый («Жаніхі». «Людовік... надцаты», «Дзень і ноч»), але калектыў, які гастралюе зараз у Менску, лічыць найлепшым частаваць глядача «клясычнымі» ўзорамі буржуазнай прадукцыі («Марыца». «Баядэрка», «Сільва». «Вясёлая удава», «Жрыца агню»), чым распрацаваць новыя савецкія пастаноўкі.

Р. Г.

„ХАБУ"
(Кіно «Культура»)

Фільм «Хабу»—кіно-аповесьць аб барацьбе людзей з тайгою, з аб непраходнымі і густымі лясамі, аповесьць аб барацьбе савецкай улады з цёмнымі дзяльцамі і прыватнымі скупшчыкамі пушнікі, якія шукаюць нажывы ў сібірскіх лясох. Вось асноўная тэма фільму.

Треба сказаць што ў сэнсе ідэолёгічнай вартасьці фільм далёка не на вышыні, ды рэжысэр, мабыць, і ня ставіў перад сабой задачу стварыць добры мастацкі фільм, які меў-бы і ідэолёгічную вартасьць. Аднак з сваімі-ж мастацкімі заданьнямі пастаноўшчык фільму Віскоўскі справіўся на зусім добра. Замест таго, каб паказаць сапраўднае жыцьцё тунгусаў, іх патрэбы і звычаі новыя пасевы ў іх побыце, рэжысэр аддаў надзвычайна многа месца наханьню, якоё па старай традыцыі абавязкова суправаджае мастацкі фільм.

Таксама мала месца адведзена паказу суровай сібірскай прыроды, паказу прыгожых краявідаў тайгі. Даволі вялікі кавалак фільму прысьвечаны паказу «арыгінальных» (з пункту погляду рэжысэра) „жартаў" п'янага будаўніка прасекі--Рыгора Лейзарава. Усё гэта змазвае асноўную ўстаноўку фільму і значна зьмяншае яе вартасьць.

Што датычыць ігры артыстых, дык яна стварае добрае ўражаньне. Дасканалыя здымкі і добры мантаж фільму робяць яго прагляд лёгкім і нянудным.

Л. Д.

КУРСЫ АБЛІГАЦЫЙ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПАЗЫК
На 7-га жніўня 1929 году.

	Купля	Прод.
1-ая залат. выйгр. пазыка.	4.85	—
Баспроц. выйгр. паз. 26 г.	128.25	130.25
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.90	101.30
10 проц. дзярж. выйгр. пазыкі 27 г.	26.22	26.32
3-я селянск. дзярж. выйгр. пазыкі 27 г.	500. 5	—
Дзярж. пазыка Ўмацав. селянск. гасп.	10.60	10.65
1-я дзярж. выйгр. пазыка інд. 1927 г.	25.86	25.96
2-я паз. Індустр. проц.	22.59	25.59
» » » 6.-проц.	25.49	25.59
11 проц. дзярж. паз. 28 г. за абл. з бягуч. куп.	104.79	104.84
12 проц. рэнтная пазыка 1927 года.	202.25	—

«СПОРТ»

Што паказаў усебеларускі вэлёпрабег

У гутарцы з нашым супрацаўніком, нам. старшыні ВСФК тав. Леў паведаміў аб выніках 1-га ўсебеларускага зорнага вэлёпрабегу.

Зорны вэлёпрабег паказаў, што фізкультурнікі справіліся з ускладненымі на іх палітычна-грамадзкімі задачамі. Аб гэтым сьведчыць тая работа, якая праведзена ўдзельнікамі прабегу ў дарозе. Так, менская каманда на заводзе «Праца» ў Чэрвеньскім раёне правяла рад гутарак з рабочымі, а таксама арганізавала суботнік у карысьць вясеньняй пасеўнай кампаніі. Усе каманды праводзілі гутаркі з сялянамі на палітычныя тэмы. Магілеўская каманда ўдзельнічала ў арганізацыі паходу Сьмілавіцкага батальёну Асоавіяхіму, дзе з посьпехам выканала рад баявых заданьняў.

У складзе ўдзельнікаў прабегу большасьць рабочых. Так, з 50-ці ўдзельнікаў прабегу—43 рабочыя, сярод іх 23 члены партыі і 13 камсамольцаў. Трэба адзначыць вялікую колькасьць дарослых рабочых, якія прынялі ўдзел у прабегу.

Удзельнікі прабегу наведвалі ў Менску рад буйных прадпрыемстваў, дзе правялі гутаркі аб выніках прабегу.

Як праходзіць двухтыднёвік фізкультуры

Па ўсіх саюзах ужо праведзены ўнутрыгуртковыя спаборніцтвы.

Учора пачаліся міжсаюзныя спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы, якія праводзяцца на пляцоўцы саду «Прафінтэрн».Каманды паасобных саюзаў выяжджалі ў іншыя гарады для таварышскіх сустрэч.

Ужо ёсьць практычныя вынікі двухтыднёвіку. У будаўнікоў, дзе зусім ня было фіз. культ. гуртко́ў зараз 70 чалавек займаецца фізкультурай. У саюзе Нархарч і транспартнікаў фізкультура была заняпала, а зараз зноў пачалі працаваць фізкультурныя гурткі.

У саюзе чыгуначнікаў у часе двухтыднёвіку праведзена досыць вялікая работа. У часе абедзенага перапынку ў чыгуначных майстэрнях праводзяцца гутаркі дактароў і інструктароў з рабочымі на фізкультурныя тэмы. Гурток фізкультуры выяжджаў у Барысаў, дзе адбыўся рад сустрэч з барысаўскімі фізкультурнікамі. Унутрыгуртковыя спаборніцтвы далі добрыя вынікі. Па пераскоках фізкультурнік Кавалёў (чыгуначнік) дасягнуў новага ўсебеларускага рэкорду: 3 мэтры 1 сантымэтр. Уцягнута ў фізкультурныя гурткі да 50 рабочых, галоўным чынам, дарослых.

У харчавікоў праведзены гутаркі ў рабочымі на 12-ці буйных прадпрыемствах. У нядзелю, 11-га жніўня, саюз наладжвае вялікую экскурсію за горад, на якой будуць арганізаваны стралковыя спаборніцтвы і вэлёкрос.

Нічога ня робіцца ў саюзе мэдсанпрацы і ў працаўнікоў асьветы. Члены гэтых саюзаў нават ня ведаюць што праводзіцца двухтыднёвік.

Водгукі на заметкі

ГЕЛЬФМАН З ДЗІЦЯЧАЙ КАМУНЫ ЎЦЁК

Па сутнасьці заметкі **гр-на Гельфмана**, які падаў скаргу ў ЦВК аб тым, што ён не атрымлівае ад Цэнтральнай дзіцячай камісіі **ніякай дапамогі па беднасьці**, Цэнтральная дзіцячая камісія пры ЦВК БССР паведамляе, што **гр-н Гельфман быў пасланы ў яўрэйскую дзіцячую камуну, дзе-б ён мог вучыцца, але ён праз 2 гадзіны адтуль уцёк** і цяпер катэгарычна адмаўляецца ісьці ў дзіцячую камуну.

ЦІ ЁСЬЦЬ ТУТ-КА СКРЫЎЛЕНЬНЕ КЛЯСАВАЙ ЛІНІІ?

У № 151 газ. «Зьвязда», у заметцы пад загалоўкам «Кулакі ў пашане ў зямельных органаў у Чэрыкаўшчыне, пісалася, што **ільготы па падатку замест беднаты даваліся гаспадаркам кулакоў і абшарнікаў.** Чэрыкаўскі РВК, Магілеўскай акругі дае некаторыя даведкі па гэтай заметцы: **Карказовіч**, былы абшарнік памёр. У Горкаўскім сельсавеце жыве яго жонка, якая ня мела зямлі да 29 году. Платнікам с.-г. падатку да 1929-30 году ня лічылася. і **ніякімі ільготамі не карыстаецца; Пухоўскі Макар** з вёскі Горак, Горкаўскага сельсавету мае 3,3 дзесяціны пахаці, 0,9 сенажаці, 2 кані, 2 каровы, 4 авечкі, 2 сьвіні на 9 едакоў, сельгаспадатак за 1928-29 год 3 руб. 10 кап. **выплаціў цалкам; Маслакоў Рыгор** з вёскі Горак мае 6 дзесяцін пахаці, 2 кані, 2 каровы, 5 авечак, 5 сьвіней, 9 едакоў, падатак 10 руб 15 кап. **выплаціў цалкам, Барсукоў Епімах**—былы вагадчык райзамчасткі мае 3,75 дзесяціны пахаці, 1,1 дзесяціны сенажаці, 2 едакі, падатак 7 руб. 05 кап. **зьняты цалкам за кошт скідачнага фонду** па сьпісе маламоцных гаспадарак Язэрскага сельсавету. **Князькоў Карней**—старшыня Чэрыкаўскага гарсавету, гаспадаркі ў Чэрыкаве ня меў, а ў вёсцы Губіншчыны, Горкаўскага сельсавету, дзе ён цяпер жыве, **падатак плаціў яго бацька бяз усякіх ільгот;** старшыня Горкаўскага сельсавету **Астапенка** за выключэньнем скідкі па прычыне прапажы каня на суму 3 р. 40 кап. **ніякіх іншых ільгот не атрымаў.** Наогул, мусіць, аўтар пераблытаў факты.

ЯКАСЬЦЬ ЦЭГЛЫ ПАЛЕПШЫЛАСЯ

Белдзяржбуд паведамляе па допісе, надрукаваным у газ. «Зьвязда», дзе пісалася аб **дрэннай якасьці цэглы цагельнага заводу № 3**, што дрэнная якасьць цэглы выклікана тым, што на заводзе была **папсавана машына, з таксама дзякуючы нядбайнасьці адміністрацыі заводу і саміх рабочых.** Зараз спэцыяльная камісія пасьля абсьледваньня **правяла рад мерапрыемстваў па палепшаньні якасьці цэглы.** Як хварабітае зьявішча, камісія адзначыла адсутнасьць сартыроўкі цэглы.

«ФАКТЫ, ЯКІХ НЕЛЬГА АДМОВІЦЬ»

Пад такім загалоўкам была дасланая заметка рэд. газ. «Зьвязда» на расьсьледваньне, дзе пісалася аб **нерацыянальным выкарыстоўваньні закупленага лёкамабілю і аб сартыроўках, якія былі адпраўлены памылкова на другую фабрыку.** Белпапертрэст паведамляе, што ў асноўным факты адпавядаюць сапраўднасьці. **Частка віны, бязумоўна, падае на трэст і тэхнічны пэрсанал папяровай фабрыкі «Чырвоная Зорка»,** пры чым трэст дае наступныя **ваўвагі:** закуплены лёкамабіль быў зусім годны для папяровай фабрыкі, але **з прычыны нізкай кваліфікацыі абслугоўваючага лёкамабіль пэрсаналу і тэхпэрсаналу фабрыкі, лёкамабіль працаваў ня досыць рацыянальна.** У 1927 годзе пасьля зьмены тэхпэрсаналу фабрыкі **недахопы зьнішчаны.** Лёкамабіль быў перакінуты на картонную фабрыку імя Варо́ўскага **з прычыны пераабсталяваньня сілавой устаноўкі і павялічэньня магутнасьці фабрыкі «Чырвоная Зорка»,** але ні ў якім разе з-за нягоднасьці для папяровых фабрык. З 2-х сартыровак, якія былі адпраўлены на фабрыку «Чырвоная Зорка», адна была адпраўлена памылкова. Зараз гэта сартыроўка была **ўстаноўлена на картоннай фабрыцы імя Варо́ўскага.** Белпапертрэст **прыняў належныя меры папярэджаньня, каб ухіліцца ад памылак у далейшым.**

МАТАР'ЯЛ БУДЗЕ СКАРЫСТАНЫ ПРЫ ЧЫСТЦЫ АПАРАТУ

У допісе «Штосьці да ня зусім добра», пісалася аб тым, што ў гор. Пятрыкаве, Мазырскай акругі працуюць у савецкіх установах і школе: **былы дзяк Грыцкевіч Рыгор** і яго жонка, **былая купчыха,** настаўнікамі ў Петрыкаўскай сямігодцы, **былы купец Кароль настаўнікам і яго брат вучыцца ў Менскім ВУЗ'е.** Мазырскае АКК паведамляе, што ўсе гэтыя факты пацьвердзіліся. **Увесь матар'ял будзе скарыстаны пры чыстцы савецкага апарату. Андрук статысты, аб якім таксама пісалася, з працы зьняты і знаходзіцца пад вартай у спраўдоме.**

НЯШЧАСНЫ ВЫПАДАК

У свой час рэд. газ. «Зьвязда» дасланая заметка на расьсьледваньне акруговаму інспэктару аховы вдароўя, дзе пісалася, што гр-н **Г.**, які зьвярнуўся да доктара **Гахштэйна** ў амбуляторыю Вакзальнага раёну № 2 падабраць акуляры, доктар **Гахштэйн уліў хвораму каплі ў вочы,** пасьля чаго гр-ну **Г.** трэба было **рабіць апэрацыю.** Па сутнасьці допісу атрыманы акт камісіі дактароў: **Камінскай-Паўловай, Кліванскай і Сітэрмана,** якія разглядзелі заяву гр-на Г.; у акце між іншым адзначаецца: 1) «**У вочнай практыцы ўжываецца з дыягнастычнай мэтай гамоатрапін, які быў упырснут у вока гр. Г. Доктар Гахштэйн тут ніякай памылкі не зрабіў.** 2) **Адсутнасьцю зьмен з боку вочнага дна ў гр-на Г. у часе наведваньня доктара Гахштэйна і пасьля апэрацыі доктара Кліванскай прадугледжваць магчымасьць прыпадку глаўкомы нельга было, тым больш, што ўнутрывочны ціск наогул ня быў павышаны пры наведваньні хворым доктара Гахштэйна.** 3) **Камісія лічыць, што доктарскай памылкі з боку Гахштэйна тут няма і гэта здарэньне трэба разглядаць, як няшчасны выпадак».**

Паведамленьні
Пасяджэньне АК МОПР'у

У пятніцу, 9 жніўня, а 7 гадз. увечары ў памяшканьні АК МОПР'у адбудзецца пашыранае пасяджэньне АК МОПР'у на якое павінны зьявіцца ўсе члены і канд. АК, якія знаходзяцца ў Менску.

Парадак дня:

1. Аб удзеле МОПР'у ў рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі.
2. Аналіз грашовага становішча.
3. Аб скліканьні акруговай канфэрэнцыі МОПР'а.
4. Папярэднія вынікі кампаніі першамайскіх падзей.
5. Аб працы сярод жактаўскіх ячэек.
3 прычыны важнасьці ўсіх пытаньняў, просьба зьявіцца без спазьненьня.

На пасяджэньне запрашаюцца члены гарыконаў, актыў жактаўскіх ячэек і гарадзкі актыў.

Мен. АК МОПР'у.

— Жанаддзел Кастрычніцкага райкому КП(б)Б паведамляе, што ў пятніцу, 9-га жніўня, а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні райкому склікаецца нарада жанарганізатараў з наступнай абвесткай дня:
1. Аб працы з жаночым актывам.
2. Аб зімовай вучобе.
3. Розное.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР Музыкальная камэдыя і кам. опэра пад маст. кіраўн. Л. Г. МІРАЕВА.
Чацьвер, 8 жніўня „НОЧЬ ЛЮБВИ" у 3-х д. Валенцінава.
Білеты ў касе тэатру ад 12—2 і ад 5 г. ув. і ў раб. касе з 12—2 і ад 4—6 гадз. увеч. Пачатак а 9 г.

КІНО-ТЭАТР „Культура" — Кіно-аповесьць у 6 частках з прадолоўем ХАБУ. Звыш праграмы-кіно-хроніка „Совкіно" № 35. Пачатак роўна а 8 гадз. Каса—ад 6 гадз.
Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — Новая мастацкая пастаноўка ЛЕСЯ. Звыш праграмы кіно-хроніка „Совкіно". 2 сэансы: пачатак 1-га с.—а 9 г. 15 м. 2-га с.—а 10 г. 45 м. Каса—ад 7 гадз.
КІНО Інтэрнацыянал — З прычыны выключнага посьпеху яшчэ 3 дні выключны мастацкі замежны баявік ТАНКРЭД І КЛЕРЫНДА. Мастацкая кіно-пазма ў 7 частках.
КІНО Пралетары — Мастацка-бытавы фільм вытворчасьці „Межрабпом-фільм" СУПРАЦІЎНІЦЫ. драма ў 7 частках. Пачатак сэансу а 7 з пал, гадз. увеч. Каса—ад 6 гадз.
КІНО Спартак — ГРАНДЫЁЗНЫ ФІЛЬМ МАСКА САРВАНА. драма ў 7 част. Каса—ад 6 гадз.—Пачатак а 7 з пал. г. ув.

АДКРЫТА ЗУБА-ЛЯЧЭБНІЦА
Мен. Акр. К-ту Чырвонага Крыжу, Інтэрнацыянальная вул., д. № 6.
Лячэньне, плёмбаваньне зубоў, выдаленьне бяз болі, лячэньне хвароб поласьці роту.
УСТАЎКА ШТУЧНЫХ ЗУБОЎ на каўчуку і золаце.
Цэны агульнадаступныя. Парада дармова.
У лячэбніцы працуюць кваліфікаваныя зубныя дактары з вялікім практычным стажам.
Членам Чырвонага Крыжу—СКІДКА.
Прыём з 9 з пал. г. ран. да 8 з пал. гадз. увечары штодзенна

І-шы дзіцячы кіно-тэатр „ЮНЫ ПІОНЭР" (будынак кіно »Пролетары») 13 ЖНІЎНЯ АДНАЎЛЯЕ СВАЮ ПРАЦУ

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА — МЭДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА
Ленінская, побач з 2-м Домам Саветаў, № 25, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 3 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутраных, хірургічныя, жаночыя, зубныя, вока нервоў, вуха, горла, носа і скуры
Фізіятрычны габінэт: кварц, электра і сьвэта-лячэньне.
Рэнтгэнаўскі габінэт робіць здымкі, прасьвечваньні і лячэньне хворых. Прыём хэміка-бактэрыял. аналіза
Прыём хворых па лекавых кніжках таварыства.
— Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную плату —

ПРАДАЮЦЦА ШКЛЯНЫЯ БАЛЁНЫ
Спытацца ў заг. гаспадаркай друкарні «Зьвязда».
Савецкая, 63, ад 3 да 5 гадз. увечары.

Кошт публікацыі 50 к. аб згубе дакумэнту

ПАСЬПЯШЭЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА на ЖНІВЕНЬ і наступныя месяцы
НА ГАЗЭТУ ЗЬВЯЗДА
орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75 к.
«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісі
БАЛЬШАВІ